Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 МАЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 90 (29712)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЧОРНАЯ ІКРА ПА-БЕЛАРУСКУ 3

ПРАФЕСІІ ЗОНЫ РЫЗЫКІ 5

КАРАТКА

• Беларуская чыгунка ў майскія святы перавезла больш за два мільёны пасажыраў.

• У Кобрынскім і Лідскім раёнах для фарміравання тэрытарыяльных войскаў прызавуць каля 430 чалавек.

• Цэнтр падтрымкі аграэкапрадпрымальніцтва з'явіўся ў аграгарадку Стрыгінь Бярозаўскага раёна.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы павінны абапірацца на айчынных вытворцаў узбраення»

Такую задачу паставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытанні дзяржаўнага абароннага заказу на 2022 год

СТАР. 2

Фота БелТА.

Эксклюзіўнае інтэрв'ю

Наталля Качанава:

«ГАЛОЎНАЕ — ТВАЯ КРАІНА, ТВОЙ НАРОД, ТВАЯ ЗЯМЛЯ. І ТЫ ПАВІНЕН ТУТ РАБІЦЬ УСЁ, ШТО АД ЦЯБЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ, КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР І СПАКОЙ»

Старшыня Савета Рэспублікі — аб народным Прэзідэнце, Канстытуцыі будучыні, гістарычнай памяці і сацыяльнай адказнасці ў эксклюзіўным інтэрв'ю газеце «Звязда». Як заўсёды — абсалютна шчыра і адкрыта, без забароненых тэм і пытанняў. Чытачы напэўна адкрыюць для сябе Наталлю Іванаўну не толькі як дасведчанага дзяржаўнага дзеяча, але і як чалавека з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, мудрага кіраўніка, надзейнага таварыша і сапраўдную беларускую жанчыну.

СТАР. 8-9

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:

«Калі казаць аб фарміраванні аб'яднанага рынку газу Саюзнай дзяржавы, то ўжо падрыхтаваны і зацверджаны адпаведны план мерапрыемстваў, таксама створана беларуска-расійская рабочая група. Ёсць тры асноўныя блокі пытанняў. Гэта фарміраванне цаны на прыродны газ на 2022 год, і тут ужо ўсе неабходныя дакументы падпісаны, цана ўстаноўлена. Адносна другога блоку пытанняў — гэта фарміраванне цаны на прыродны газ на 2023 год, тут работа павінна быць завершана да 1 жніўня з падпісаннем адпаведных дакументаў. Трэці блок пытанняў — гэта вызначэнне і ўзгадненне прынцыпаў функцыянавання аб'яднанага рынку прыроднага газу Саюзнай дзяржавы. Да 1 ліпеня мы павінны падрыхтаваць адпаведныя прапановы і іх узгадніць у выглядзе ўжо канкрэтных прынцыпаў функцыянавання аб'яднанага рынку прыроднага газу».

МУЗЕЙ З ВОДАРАМ ХЛЕБА

У Бацвінаўскім музеі хлеба ў маі запланавана не менеш чым пятнаццаць экскурсій для дзяцей Гомельскай вобласці. Гаспадыня музея Ірына НІКІШОВА падлічыла, што за чатыры папярэднія месяцы ўстанову наведала больш за тысячу восемсот хлопчыкаў і дзяўчынак. Да кожнай экскурсіі Ірына Міхайлаўна загадзя сур'ёзна рыхтуецца: па рэцэпце сваёй матулі замешвае муку, ставіць цеста ў адмысловую драўляную дзяжу, каб спорна падыходзіла. Пры гэтым гаспадыня прамаўляе сакральныя словы і просіць, каб цеста было паслухмянае, а пірог атрымаўся пышны, духмяны ды прыгожы. Калі цеста падышло, раскладае яго ў формы, ставіць у гарачую печ-духоўку. Да прыезду гасцей выпечка заўсёды гатовая, астывае пад ільняным ручніком, а пякарня-музей яшчэ доўга захоўвае непараўнальны водар. Перад тым як пачаставаць гасцей караваем, Ірына Міхайлаўна расказвае і паказвае аўтэнтычныя прылады, без якіх яшчэ ў не такі далёкі час не абыходзілася ні адна сялянская сям'я — каб сеяць жыта, пшаніцу і быць з ураджаем, з хлебам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Чачэрскі раён.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«Мы павінны абапірацца на айчынных вытворцаў узбраення»

Тое эфектыўнае, што простае і надзейнае

«Абаронна-прамысловы комплекс — адзін з найважнейшых высокатэхналагічных сектараў беларускай эканомікі. І, зразумела, абапірацца мы павінны на айчынных вытворцаў узбраення. Вядомымі айчыннымі брэндамі застаюцца аўтаматызаваныя сродкі кіравання войскамі і зброяй распрацоўкі холдынга «АГАТ», оптыка, якая заўсёды каціравалася ў Беларусі і сёння актуальна, — гэта вытворчасць «Пеленга» і БелОМА, а таксама цягачы вытворчасці МЗКЦ», — сказаў Прэзідэнт.

Шырокае прызнанне на сусветным рынку, паводле кіраўніка краіны, атрымалі створаныя беларускімі спецыялістамі радыёэлектронныя сродкі барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі.

«Электроніка для нас была адным з разумных сектараў эканомікі ў савецкі перыяд. Глядзіце, як яна нам сёння спатрэбілася. Добра, што ўсё захавалі», — заўважыў Прэзідэнт.

Ён працягнуў, што і ракетны комплекс «Паланэз», зенітны ракетны комплекс сярэдняй далёкасці «Бук-МБ» і ракеты да яго паказваюць надзейнасць і эфектыўнасць.

«Ручныя гранатамёты, стралковая зброя і боепрыпасы сведчаць аб сур'ёзным навуковым і вытворчым задзеле нашага абаронна-прамысловага комплексу. Актыўна вядзецца работа па стварэнні рабатызаваных сродкаў агнявога паражэння, ударных беспілотных комплексаў, супрацьтанкавых кіруемых ракет», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт акцэнтаваў, што галоўнае — не перастарацца. «У нас айцішнікі ствараюць такое ўзбраенне, пра якое людзі кажуць, што ім не патрэбныя сучасныя танкі. Просяць: «Дайце нам Т-72. Гэта роднае, простае і не менш эфектыўнае». Таму нідзе нельга перабольшыць з гэтымі найразумнейшымі тэхналогіямі», — сказаў кіраўнік краіны.

У войскі паступаюць найноўшыя зенітныя ракетныя комплексы «Тор-М2», радыёлакацыйныя станцыі «Праціўнік», «Сопка», «Усход», «Раса», комплексы радыёэлектроннай барацьбы «Навальніца», працягнуў Прэзідэнт.

«Як было заўважыць апараты, якія нізка ляцяць? Цяжка было нашымі магутнымі радыёэлектроннымі сродкамі заўважыць. Стварылі «Расу». І сёння вельмі запатрабаваная. Паглядзіце на ўрокі Украіны. Некалькі ўдараў было нанесена па тэрыторыі Расіі ўкраінскай арміяй. Як падабраліся туды беспілотнікі і верталёты? На брыючым палёце. А заўважыць іх заўсёды больш складана, чым на вялікай вышыні. Неабходныя спецыяльныя радыёэлектронныя ўстаноўкі», — расказаў Аляксандр Лукашэнка пра важнасць «Расы».

Узброеныя Сілы, па яго словах, атрымліваюць лёгкабраніраваныя аўтамабілі «Кайман», мадэрнізаваныя танкі Т-72. Абнаўляецца парк авіяцыйнай тэхнікі — у строй пастаўлена і асвоена каля 30 сучасных лятальных апаратаў розных тыпаў (Су-30СМ, Як-130, Мі-8МТВ5).

Урокі Украіны

Па словах Прэзідэнта, пытанні дзяржаўнага абароннага заказу абмяркоўвалі ў канцы мінулага — пачатку гэтага года ў Цэнтры стратэгічнага кіравання Міністэрства абароны.

«Тады мы па-іншаму бачылі і сваю армію, і, перадусім, узбраенне сваёй арміі. І абсалютна шчыра: ваенная аперацыя Расійскай Федэрацыі ва Украіне нас многаму навучыла. З першага дня гэтай аперацыя я патрабаваў ад кіраўніцтва Міністэрства абароны з улікам урокаў вайны вызначыцца, якая вайна будзе, не дай Бог, у Беларусі, якая зброя нам будзе неабходная для нашай арміі, калі нам прыйдзецца абараняць сваю краіну», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ад міністра абароны ён патрабуе пастаянна сачыць за сітуацыяй, рабіць высновы.

«Мне было даложана, што ўрокі вынесены. І калі я задаў пытанне: з пазіцыі сённяшняга дня падыходы да ўзбраення беларускай арміі, яе колькасці і як будзе ваяваць, змяніліся? Так, змяніліся, іначай і быць не магло. Вось пад гэтым вуглом мы павінны сёння разгледзець наш дзяржаўна-абаронны заказ на бягучы год. Гэта галоўны дакумент, які мы сёння павінны прыняць і які рэгламентуе пытанні паставак для нашых Узброеных Сіл узбраення, ваеннай тэхнікі і іншых матэрыяльных сродкаў», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

У сённяшнім становішчы дадзены парадак дня як ніколі актуальны, заявіў Прэзідэнт. «Падзеі, якія адбываюцца ва Украіне, наглядна паказваюць, што толькі войскі, якія валодаюць сучаснай, высокаэфектыўнай і неабходнай на нашай тэрыторыі зброяй, сродкамі жыццезабеспячэння, палівам і харчаваннем, здольныя вырашаць пастаўленыя задачы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён зрабіў выснову, што большую ўвагу з часоў Савецкага Саюза ваенныя людзі аддавалі ўзбраенню.

«Падзеі ва Украіне паказалі, што не толькі гэта важна. Важна ў час накаркіць салдата. У час падвезці боепрыпасы і харчаванне, разгарнуць медыцынскія пункты. То-бок, сучаснае тылавое забеспячэнне, здавалася б, суперрэвалюцыйнай і мадэрнізаванай арміі, сённяшняй, як і раней, іграе найважнейшую ролю», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Урок Украіны і ў тым, па яго словах, што армія павінна быць мабільнай. Ён нагадаў, што каля 10 гадоў таму пераканаў ваенных: неабходна ісці да мабільнасці арміі. «Нечаканасць у любой вайне іграла важную ролю. А для гэтага неабходна быць мабільнымі. Так мы будавалі і перабудоўвалі ў трэці ці чацвёрты раз свае Узброеныя Сілы, сваю армію», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адзін урок Украіны, па яго словах, — сувязь у арміі.

«Без сувязі няма арміі. Вельмі шмат было пытанняў да сувязі. Гэта наша тэма, — заўважыў Прэзідэнт. — Без сувязі няма арміі. Не патрэбна нейкая зброя, калі няма сувязі».

Прадугледзець усё

На падтрыманне абароназдольнасці войска, акцэнтаваў Прэзідэнт, не шкадуем сродкаў, але кожны выдаткаваны рубель павінен быць скарыстаны разумна і па-гаспадарску. І гэта яго прынцыповае, цвёрдае патрабаванне.

«Мы паглядзелі, зрабілі высновы, супакоіліся і бачым, што нам неабходна змяняць пазіцыю. Нам столькі такой зброі, як хацелі мець, не трэба. А што необходна мець, я толькі што казаў. Выходзячы з нашых магчымасцяў і тых умоў, у якіх нам прыйдзецца ваяваць. Мы не збіраемся ні на кога нападаць», — заявіў кіраўнік краіны.

«Мы павінны аб'ектыўна бачыць тое, што адбываецца на тэрыторыі Беларусі і вакол. Таму што калі мы неадэкватна ацэнім абстаноўку і не сплануем свае дзеянні, мы будзем мець бледны выгляд у любым сутыкненні, канфліктнай сітуацыі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Дарэчы, Прэзідэнт расказаў, што расійскія спецыялісты дапамогуць у распрацоўцы перспектыўных узораў узбраення, перш за ўсё ракетнага.

«Я прэм'ер-міністру ставіў адпаведную задачу пасля апошняй сустрэчы на Далёкім Усходзе з Прэзідэнтам Расіі. Мы дамовіліся адназначна: Пуцін, Рагозін (кіраўнік «Раскосмаса» Дзмітрый Рагозін. — **«Зв.»**), Лукашэнка, хто там яшчэ былі — людзі, якія займаюцца ракетнай вытворчасцю ў Расіі, каб яны паглядзелі на нашы распрацоўкі. Мы ж ствараем новую ракету. Ракету вельмі эфектыўную, узору «Іскандэр» прыкладна, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Пры мне Прэзідэнт паставіў задачу Дзмітрыю Рагозіну неадкладна аказаць падтрымку, каб мы не стваралі веласіпед, каб мы маглі задзейнічаць вопыт распрацоўшчыкаў, ракетчыкаў Расійскай Федэрацыі, якія рабілі «Іскандэр».

Ён адзначыў, што ведае пра маштабнае вучэнне НАТА каля граніц Беларусі, наконт чаго з'яўляюцца разнастайныя меркаванні, пытанні журналістаў. Прэзідэнт заявіў, што міністру абароны і Генштабу пастаўлена задача: прадугледзець усё.

«Мы павінны бачыць, што адбываецца на сумежных тэрыторыях, пагранічнікі шмат інфармацыі даюць, Камітэт дзяржбяспекі. Ды і ваенныя бачаць, што адбываецца. Разведка павінна працаваць. Нас ніхто не павінен заспець знянацку — урок мінулай вайны. Мы не агрэсары. Ні на кога не збіраемся наступаць, але порах трэба не толькі трымаць сухім на перспектыву, але сёння і вуха неабходна трымаць востра. Неабходна бачыць, што робіцца побач з нашымі граніцамі», — сказаў Прэзідэнт.

У гэтым заключаецца і сэнс праверкі боегатоўнасці айчыннай арміі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт паведаміў пра дамоўленасць з Расіяй пакінуць комплексы С-400 у Беларусі і падрыхтаваць групы байцоў, якія будуць валодаць гэтай тэхнікай.

«Верагодна, мы пакінем С-400, якія ў нас ёсць. Ён з Мінска будзе бачыць да Берліна. Гэта зброя прызнаная для буйных армій і буйных тэрыторый, як расійская. Але навошта нам бачыць, што там у Берліне... Можа, нам і не трэба? Ды і С-300, якім мы ўзброены, дастаткова добрая, сучасная зброя, фактычна, як С-400. Але С-400 — добрая тэхніка. Мы яе бачылі і ў гэтай аперацыі», — паведаміў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны заявіў пра дамоўленасць з Расіяй аб пакупцы «Іскандэраў».

«Іскандэры» — вельмі неабходная нам зброя. Яна ў нас ёсць. Зноў жа я дамовіўся з расіянамі, што мы купляем у іх «Іскандэры». Яны выводзіцца з Беларусі не будуць і будуць задзейнічаны для абароны нашай прасторы. І тое, што ў нас ёсць, для арміі добрае ўзбраенне. Гэта кажа пра тое, што наша армія будзе здольная ваяваць і нанесці праціўніку непрымальную шкоду», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ён рэаліст і разумее, што перамагчы НАТА не ўдасца. «А вось шкоду нанесці, асабліва тым тэрыторыям, з якіх нас будуць атакаваць, у нас такая зброя ёсць. Гэта зброя, якая пакрывае ўсю тэрыторыю Польшчы і да Балтыкі. Я не кажу ўжо аб прыбалтыйскіх дзяржавах. І практычна Украіну за Кіеў. Я, крый божа, не намяваю ні на што, але каб разумелі далёкасць стральбы той зброі, якая ў нас ёсць», — дадаў кіраўнік краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН расказаў, што Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапановы па фарміраванні дзяржаўнага абароннага заказу краіны на 2022 год.

Пры гэтым міністр заявіў, што Беларусь не плануе павялічваць абаронны бюджэт. «Абаронны бюджэт будзе той, які цяпер спланаваны, выдзелены. Дадатковых бюджэтных затрат не спатрэбіцца», — сказаў кіраўнік ведамства.

Міністр дадаў, што беларускія ваенныя сёння дэталёва вывучаюць тактыку дзеянняў УС Расіі і Украіны. «Бачым, якія нам неабходна зрабіць удакладненні ў рамках падрыхтоўкі нашых Узброеных Сіл, у рамках аператыўнай пабудовы плана абароны і мадэрнізацыі ўзораў узбраення і закупкі. Па гэтых трох кірунках мы і будзем працаваць», — удакладніў Віктар Хрэнін.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Віктар Хрэнін адзначыў, што ва Узброеных Сілах Беларусі ўважліва назіраюць за тым, што адбываецца ў суседніх краінах падчас правядзення буйнамаштабных вучэнняў НАТА «Абаронца Еўропы — 2022», і адэкватна рэагуюць на падзеі. Міністр нагадаў, што ў Беларусі з 4 мая праходзіць раптоўная праверка сіл рэагавання. «Усё гэта спланавана як адэкватная рэакцыя на вучэнні, якія з 1 мая праходзяць на тэрыторыі краін НАТА пад назвай «Абаронца Еўропы». Мы бачым кожны іх рух, бачым, якія батальённыя тактычныя групы задзейнічаны, на якіх палігонах, якія пытанні яны збіраюцца адпрацоўваць. Разумеючы пэўныя пагрозы, што могуць зыходзіць ад іх, мы адэкватна рэагуем, на гэтыя напрамкі выстаўляем адпаведныя войскі», — сказаў Віктар Хрэнін.

Дзмітрый ПАНТУС, старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, расказаў пасля нарады, што ў беларускую армію будуць пастаўлены мадэрнізаваныя ракетныя сістэмы залпавага агню і ракетныя комплексы.

«Мы завяршылі работы па мадэрнізацыі ў поўным аб'ёме і пастаноўцы на ўзбраенне РСЗА «Ураган», РСЗА «БелГрад», а таксама ЗРК «Аса». Гэтыя тры сродкі паражэння ў поўным аб'ёме прайшлі ўсе выпрабаванні ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь і ў рамках дзяржаборонзаказу і дзяржаўнай праграмы ўзбраення паступова будуць пастаўляцца ва Узброеныя Сілы», — расказаў Дзмітрый Пантус.

Ён паведаміў журналістам, што ў Беларусі працягваюцца выпрабаванні новых ракет для комплексаў «Паланэз» і «Бук». «Ракетабудаванне на сённяшні момант — адзін з ключавых напрамкаў Дзяржкамваенпрама», — заявіў старшыня камітэта.

❍ Даслоўна

Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ:

— ЗША і іх саюзнікі працягваюць нарошчваць ваенную прысутнасць каля Дзяржаўных граніц Рэспублікі Беларусь. Створаная групоўка за апошнія шэсць месяцаў выраслa больш чым у два разы як у колькасных, так і ў якасных адносінах. З'яўленне ў акваторыі Міжземнага і Балтыйскага мораў групоўкі, якая нясе крылатыя ракеты марскога і паветранага базіравання, павелічэнне авіяцыйнай групоўкі ў краінах Польшчы і Балтыі сведчыць аб нарастаючай пагрозе для Рэспублікі Беларусь.

Неабходна адзначыць, што праводзіцца шэраг вучэнняў на тэрыторыі Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Вучэнне «Абаронца Еўропы», на якім мяркуецца задзейнічаць да 20 тысяч чалавек і вялікую колькасць тэхнікі, яшчэ сем вучэнняў на тэрыторыі краін, што мяжуюць з Рэспублікай Беларусь. Пры гэтым адпрацоўка пытанняў па прымяненні разведвальна-дыверсійных сіл, высадка дэсанта, прымяненне сіл спецыяльных аперацый не сведчыць аб міралюбівай накіраванасці дадзеных вучэнняў. Выходзячы з гэтага, ва Узброеных Сілах выпрацаваны цэлы комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на супрацьдзеянне магчымым пагрозам.

У межах другога этапу праверкі сіл неадкладнага рэагавання на заходні і паўночна-заходні аператыўныя кірункі высунуты батальённа-тактычныя групы. Для іх узмацнення вылучаюцца падраздзяленні супрацьпаветранай абароны, ракетных войскаў і артылерыі, якія будуць забяспечваць іх баявое функцыянаванне. На паўднёвым аператыўным кірунку створаная Узброенымі Сіламі Украіны групоўка агульнай колькасцю да 20 тысяч чалавек таксама патрабуе ад нас рэакцыі. Сілы спецыяльных аперацый, якія разгорнуты на трох тактычных напрамках, забяспечваюць бяспеку Рэспублікі Беларусь на паўднёвым кірунку. Акрамя таго, з учарашняга дня пад маім кіраўніцтвам праводзіцца праверка двух раёнаў тэрытарыяльнай абароны. Разгорнутыя падраздзяленні тэрытарыяльных войскаў будуць выконваць задачы па ахове важных аб'ектаў.

Эканоміка

Карпа дастаткова, нам бы яшчэ і фарэлі пабольш

У нашай краіне летась вырашчана каля 15 тысяч тон рыбы

Пра гэта расказала намеснік начальніка аддзела Галоўнага ўпраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вольга БАРЭЙША.

Дзяржбюджэт дапамог

Вытворчасць рыбы ў 2021 годзе засталася стабільнай у параўнанні з узроўнем 2020-га — 14,8 тысячы тон, што складае практычна 100 % да плана. Такога выніку ў няпростых умовах удалося дасягнуць дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, лічыць Вольга Барэйша.

З дзяржбюджэту на набыццё кармоў для рыбы і пагашэння запазычанасці па камбікорме было накіравана 9,7 мільёна рублёў, на лячэбна-прафілактычныя мерапрыемствы — 143 тысячы рублёў, на вапнаванне сажалак рыбаводных арганізацый — 132 тысячы рублёў. Гэтыя мерапрыемствы дазваляюць рыбаводным арганізацыям, акрамя дасягнення паказчыкаў па вытворчасці, падтрымліваць і санітарны дабрабыт сажалкавага фонду.

Спецыяліст адзначыла, што стабільнымі засталіся не толькі вытворчасць, але і відавая структура. У сажалкавай рыбе пераважае карп і таўсталобік, у вытворчасці каштоўных відаў рыб — фарэль, а ў структуры ўлову промыслам — лешч, шчупак, таўсталобік і іншыя.

Вугор будзе з намі

У мінулым годзе вялікая ўвага ўдзялялася мерам, накіраваным на павышэнне эфектыўнасці і відавой разнастайнасці ў натуральных рыбалоўных угоддзях і захаванню папуляцыі еўрапейскага вугра. Летась у натуральныя рыбалоўныя ўгоддзі было выпушчана іх 88 тон, або 5,5 мільёна штук рыбапасадачнага матэрыялу — гэта 115 % да ўзроўню 2020 года.

— У цэлым мінулы год для рыбнай галіны стаў падзейным, нягледзячы на ўсе перашкоды, з якімі сутыкнулася гэтая сфера. Ён, несумненна, дае надзею на далейшыя пераўтварэнні як у рыбаводстве, так і ў рыбалоўстве», — упэўнена Вольга Барэйша.

Ключавой падзеяй стала падпісанне Прэзідэнтам двух указаў — № 279, накіраванага на фінансавае аздараўленне і стабілізацыю эканамічнага становішча рыбаводных арганізацый, і № 284, якім зацвярджана новая рэдакцыя правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і правілаў аматарскага рыбалоўства.

— У рамках указа № 279 рэалізоўваецца комплекс мер, згодна з якімі актывы рыбаводных арганізацый Беларусі былі перададзеныя ў агенцтва па кіраванні актывамі, а акцыі — у давернае кіраванне эканамічна больш багатым рыбаводным арганізацыям, меліярацыйным арганізацыям і ГА «Белводгас». Пакуль рана казаць аб выніках, але прагноз станоўчы, — падкрэсліла спецыяліст.

Таксама яна адзначыла, што Мінсельгасхарч, Нацыянальная акадэмія навук, Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету прымаюць меры, якія спрыяюць укараненню правілаў указа № 284. Як вядома, указ уступіць у сілу з 29 ліпеня 2022 года. Пункты ўказа датычацца падводнага палявання, збыту і захоўвання рыбалоўных сетак, арэнды рыбалоўных угоддзяў і гэтак далей.

Карп — не адзіны від рыбы

Як вядома, больш за 90 працэнтаў таварнай рыбы Беларусі вырошчваецца ў сажалкавых рыбаводных гаспадарках. Гэта значыць, што на найбліжэйшую перспектыву сажалкавы кірунак застаецца дамінантным валаўтваральным напрамкам рыбаводства. Пра гэта паведаміў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РУП «Інстытут рыбнай гаспадаркі» Уладзімір КАСТАВУСАЎ.**

— У сажалкавым рыбаводстве базавым відам з'яўляецца карп. Аб'ёмы яго вырошчвання вызначаюць валавыя аб'ёмы вырошчвання рыбы. А долю карпа за апошнія некалькі гадоў удалося знізіць з 92—95 % у агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі да 71 %, — адзначыў Уладзімір Каставусаў. — Тым не менш менавіта гэты від вызначае і структуру, і валавыя паказчыкі вытворчасці. Выходзячы з гэтага, трэба рабіць высновы на перспектыву далейшага развіцця гэтага напрамку.

Паводле слоў спецыяліста, сажалкавае рыбаводства ёсць і будзе заставацца асноўным стратэгічным напрамкам развіцця галіны.

Закрануў намеснік дырэктара і тэму харчавання рыбы. У свой час бялковыя кампаненты камбікармоў імпартаваліся, але сёння іх пастаўкі праблематычныя. Задача інстытута — максімальна мінімізаваць тыя выдаткі і страты, якія наносяцца складанымі знешнеэканамічнымі ўмовамі.

— Цяпер у нашай краіне вядуцца распрацоўкі на асваенне вытворчасці айчынных кампанентаў, у прыватнасці па бялку, па павышэнні засваяльнасці вугляводнага складніка рыбаводных кармоў, — падзяліўся Уладзімір Каставусаў.

Праблема чырвонай рыбы ў мальках? Ці ў грашах?

Як адзначыў Уладзімір Каставусаў, галоўная прычына скарачэння ўлову фарэлі ў 2021 годзе да 126,5 тоны (у 2020 годзе — 240,6 тоны) — недахоп пасадачнага матэрыялу па канкурэнтнай для нас цане.

Адзіны вытворца малькоў фарэлі ў нашай краіне — ААТ «Фарэлевая гаспадарка «Лохва», якой некалькі гадоў таму перадалі Гарэцкі комплекс па вырошчванні малькоў, — настолькі павялічыў на іх цэны, што іх купля стала па кішэні толькі хіба што замежнаму пакупніку. У нашым выпадку — расійскім вытворцам ласасёвых. Выбіраючы вялікі прыбытак, прадпрыемства забылася аб патрэбах унутранага рынку. Калі айчынныя вытворцы таварнай рыбы не здольны своечасова разлічыцца за пасадачны матэрыял, то расійскі бізнес гатовы заплаціць.

Пры гэтым у «Лохве» скарацілі і ўласную вытворчасць.

За тое, што манапаліст зрабіў непад'ёмную цану на малька, быў заслужана раскрытыкаваны Мінсельгасхарчам. Пасля ўмяшання ў сітуацыю Магілёўскага аблвыканкама цэннік быў значна зніжаны для айчынных вытворцаў. Напрыклад, рыбгас «Альба», які вырошчвае фарэль, у гэтым годзе купляў сяголеткаў чырвонай рыбы ўжо па прымальнай цане.

Асятрына і чорная ікра — не толькі на экспарт

— Мы доўгі час гналіся за аб'ёмамі вытворчасці, але ж пасасёвыя і асятровыя — не прадукт штодзённага спажывання. Мяса асятра мы не ямо кожны дзень, — заўважае Вольга Барэйша. — Міністэрства нацэльвае рыбгасы не гнацца за лічбамі, а дамагацца фінансавай устойлівасці, працаваць паводле прынцыпу эканамічнай мэтазгоднасці. Разам з тым мы ствараем такія ўмовы дзейнасці для гаспадарак, каб рыба была даступная для людзей.

Беларусь нельга назваць рыбнай краінай, але галіна можа па-ранейшаму папесціць і асятрынай. Прычым першай свежасці. І нават чорнай ікрой. У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя да павелічэння вытворчасці асятровых (асетр, сцерлядзь, бялуга), — канстатуе Вольга Барэйша.

І хоць па выніках 2021 года ўлоў асятровых у цэлым па краіне знізіўся з 147,5 тоны ў 2020-м да 108,1 тоны, рыба ў беларускіх сажалках працягвае расці, набіраць вагу, нагульваць ікру. Гэта значыць, у найбліжэйшыя гады вырастуць і прадажы.

Асятрына і чорная ікра — тавар з высокім экспартным патэнцыялам. Ёю займаецца яшчэ адзін беларускі вытворца асятровых — Нясвіжскі агракамбінат. Так, асетр, які пражывае ў дзікай прыродзе, знаходзіцца на мяжы знікнення, дакументы гэтай нашай рыбкі, якая перасякае мяжу краіны, павінны быць пазначаныя, умоўна кажучы, пячаткай «Не кантрабанда дзікага ласося!». Гэтага патрабуе Канвенцыя аб міжнародным гандлі відамі дзікай фаўны і флоры, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Для набыцця такога «пашпарта» Мінсельгасхарч, Мінпрыроды і нясвіжцы, якія вырошчваюць асятра, шмат месяцаў рыхтавалі дарожную карту праекта для замежных продажаў. Неўзабаве асятра з Нясвіжа адправяць на экспарт.

Смак сома ведаюць і любяць не толькі гурманы. Пры гэтым сом не валодае экспартным патэнцыялам: за мяжу яго не прадаюць. Кожную асобіну вырошчваюць у сажалкавых гаспадарках доўга, як мінімум чатыры гады. Мальком сома таксама зарыбляюць арандатары свае вадаёмы. Гэта прыцягвае аматараў платнай рыбалкі.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць амерыканцаў лічыць антырасійскія санкцыі пагрозай для саміх ЗША, а не для Расіі

Большасць амерыканцаў лічыць, што санкцыі Вашынгтона супраць Масквы ў большай ступені шкодзяць самім Злучаным Штатам, паведамляе брытанскае выданне Daily Express.

Апытанне, праведзенае Інстытутам дэмакратыі (аналітычны цэнтр, які базіруецца ў Вашынгтоне), паказала: 53 працэнты амерыканцаў лічаць, што санкцыі больш за ўсё шкодзяць самім ЗША, 44 працэнты — Расіі.

Пры гэтым 43 працэнты апытаных не пярэчылі б, калі б ЗША дазволілі Украіне прайграць у процістаянні з Расіяй. Супраць такога выходу выказаўся 41 працэнт рэспандэнтаў.

Толькі 38 працэнтаў амерыканцаў ухваляюць тое, як прэзідэнт Джо Байдэн спраўляецца з украінскім крызісам, 52 працэнты — не ўхваляюць. У цэлым дзеянні Байдэна ў знешняй палітыцы не ўхваляюць 56 працэнтаў рэспандэнтаў, 40 працэнтаў — ухваляюць. Адзначаецца, што давер амерыканцаў быў падарваны пасля «катастрафічных дзеянняў» ЗША пры вывадзе войскаў з Афганістана, а палітыка Байдэна ў канфлікце з Украінай толькі пагоршыла сітуацыю.

У цэлым, 63 працэнты выбаршчыкаў не вераць, што Джо Байдэн будзе перавыбраны ў 2024 годзе.

У Кітаі заклікалі краіны, якія сталі на шлях развіцця, аб'яднаць намаганні супраць санкцыяў Захаду

Санкцыі Захаду супраць Расіі наносяць урон усёй глабальнай эканоміцы, таму краінам, якія сталі на шлях развіцця, неабходна скаардынаваць намаганні для процістаяння гэтым санкцыям, гаворыцца ў артыкуле кітайскай газеты Global Times, паведамляюць PIA «Навіны».

Газета адзначае, што планы калектыўнага Захаду ўвесці санкцыі супраць расійскай нафты могуць прывесці да эканамічных наступстваў для ўсяго свету. Нафтавае эмбарга справакуе рост цэн на чорнае золата, што прывядзе да яшчэ большай інфляцыі.

Пры гэтым, адзначае выданне, такія санкцыйныя меры могуць прывесці да доўгатэрміновых эканамічных наступстваў. У такой сітуацыі цяжар эканамічнага крызісу ляжа на дзяржавы, у якіх фарміруецца рыначная эканоміка.

Global Times бачыць выхад з дадзенай сітуацыі ў наладжванні каардынацыі і эканамічным супрацоўніцтве паміж краінамі, якія сталі на шлях развіцця. Такое ўзаемадзеянне сёння можна ажыццявіць на ўзроўні членаў БРЫКС — Бразіліі, Расіі, Індыі, Кітая і ПАР. Гэтым дзяржавам, адзначае газета, час зрабіць першы крок, стварыўшы ўласны механізм фінансавай каардынацыі.

На выбарах у Паўночнай Ірландыі перамаглі нацыяналісты. Гэта пагражае Брытаніі распадам

Прыхільнікі адзінай Ірландыі святкуюць гістарычны поспех: нацыяналістычная партыя «Шын Фейн» («Мы самі»), якая дзейнічае па абодва бакі граніцы, упершыню атрымала перамогу на мясцовых выбарах на поўначы вострава.

Гэта кідае выклік тэрытарыяльнай цэласнасці Злучанага Каралеўства. Зрэшты, мясцовая сістэма стрымак і процівагаў ускладняе правядзенне ў Паўночнай Ірландыі рэферэндуму аб аддзяленні ад Вялікабрытаніі.

Ключавы пункт праграмы «Шын Фейн» — аб'яднацца з асноўнай часткай вострава, незалежнай Рэспублікай Ірландыя. Больш за тое, гэтая партыя дзейнічае па абодва бакі граніцы, і сёння ў ірландскім парламенце яна — галоўная апазіцыйная сіла.

Надвор'е

Майскія замаразкі ўжо прайшлі?

Спецыялісты кажуць, што так

У далейшым тэмпературны фон у начныя гадзіны будзе знаходзіцца ў межах станоўчых значэнняў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Самы гарачы дзень тыдня будзе ў чацвер. Пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень месцамі магчымыя навальніцы. Удзень прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў да 15 цяпла, удзень — плюс 17—24 градусы, у паўднёвых раёнах — да 25—27 градусаў вышэй за нуль.

У канцы тыдня мы трапім у зону дажджу. 13 мая, ноччу і раніцай месцамі, а ўдзень па крайняй поўначы краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў, удзень будзе 14—20 цяпла, па поўдні — да плюс 22 градусаў.

У суботу зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу — ад 6 да 12 цяпла, удзень ад плюс 13 да 20 градусаў, па поўдні месцамі чакаецца да плюс 22 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у далейшым дзённы тэмпературны фон трохі панізіцца і будзе на пару градусаў адставаць ад нормы. У нядзелю і панядзелак — кароткачасовыя дажджы, навальніцы. У нядзелю ўначы — плюс 3—10 градусаў, днём — 12—19 цяпла. У панядзелак уначы — ад плюс 2 да 7 градусаў, удзень — ад плюс 10 да 17 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2022.Ч.002.00038** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-55-08.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 13.06.2022 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Помещение с кадастровым номером 60:27:0020304:628 площадью 124,4 кв. м, назначение – нежилое, по адресу: Российская Федерация, Псковская обл., г. Псков, ул. Яна Фабрициуса, д. 25, пом. 1003, расположено на этаже № 1 здания с кадастровым № 60:27:0020304:41.

Нач. цена: 304 566,84 бел. руб. без учета НДС.

Задаток: 30 456,68 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП.

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 10.06.2022.

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – КУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия электронных торгов: победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; в случае недостижения согласия между Продавцом и Покупателем по срокам оплаты предмета эл. торгов предмет эл. торгов оплачивается в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. НДС от цены продажи предмета эл.торгов уплачивается сверх стоимости предмета эл. торгов. Оплата налога на доходы иностранных организаций, не осуществляющих деятельность в Республике Беларусь через постоянное представительство, осуществляется за счет Продавца недвижимого имущества. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения электронных торгов. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество – торговые здания и помещения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 212-265383.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):

№ лота	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	Изолированное помещение (назначение: помещение финансового назначения; наименование: сберкасса) с инвентарным номером 240/D-51294, общей площадью 156 кв. м	Витебская обл., г. Орша, ул. Красногвардейская, 3-61	72 000,00 руб., в т. ч. НДС по ставке 20 % – 12 000,00 руб.

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 13.06.2022.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 13.06.2022 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 15.06.2022 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Победитель аукциона либо единственный участник дополнительно возмещает расходы по оценке имущества в размере 263,33 руб. с НДС.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 118,63 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): кассовая кабина на одно рабочее место (инв. номер 215990000002759), козырек над входной группой (инв. номер 215990000002760), манометр (инв. номера ВН 133878, ВН 133879, ВН 133880).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предмет торгов – лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-67331 (наименование: помещение для установки машины; назначение: здание нежилое), площадью 105,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001033294, площадью 0,0595 га

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	13 200,00	Размер задатка, руб.	1 320,00

Продавец: ОАО «Брестский электромеханический завод», Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202, тел. 80162321933. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее 13 июня 2022 г. 17.00. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 14 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 13 июня 2022 г. до 17.00

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

Лот	Наименование лота	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN	Задаток, BYN	Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN
1	Изолированное помещение – складское помещение, назначение – склад несгораемых материалов, с инв. 500/D-978819391, общей площадью 37 кв. м	43 446,00	4 344,60	2 172,30

Лот № 1 находится на цокольном этаже капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005142, по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 23. Площадь земельного участка – 0,7029 га. Целевое назначение – строительство объектов: «Многоэтажный жилой дом, не повышенной комфортности, с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр-та Дзержинского – пр-та Жукова – ул. Железнодорожной – ул. Щорса, 1-й этап»

В отношении лота проводятся четвертые повторные торги. Стоимость снижена на 35 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 27 (29649) от 10.02.2022, стр. 15, № 52 (29674) от 17.03.2022, стр. 10, № 68 (29690) от 08.04.2022, стр. 15, № 79 (29701) от 23.04.2022, стр. 11

Лот	Наименование	Местонахождение лотов	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
2	Комплект полок для документов, 2 шт.	Республика Беларусь, Минский район, д. Обчак, 223010	19,08	1,91	0,95
3	Кресло офисное Менеджер DF HLN SP-A, 4 шт.		79,20	7,92	3,96
4	Стол письменный на мет. опорах, 1 шт.; стол письменный на мет.опорах, 2 шт.; стол письменный на мет. опорах, 2 шт.; стол письменный криволинейный левый, 1 шт.; стол письменный криволинейный правый, 4 шт.; стол письменный на мет. опорах, 1 шт.		693,00	69,30	34,65
5	Стол приставка (К373), 1 шт.; стол приставка (К371/Кредо/брнат), 6 шт.; стол приставка (К372/Кредо/брнат), 6 шт.; стол приставка (К373/Кредо/брнат), 4 шт.; стол приставка (К374/Кредо/брнат), 1 шт.		388,80	38,88	19,44
6	Тумба под системный блок (К510/Кредо/брнат), 11 шт.; тумба приставная, 9 шт.		197,64	19,76	9,88
7	Шкаф (Т404/Тема/плт), 1 шт.; шкаф для одежды (К49С+КД3/Кредо/брнат), 2 шт.; шкаф для документов, 2 шт. Тумба (Т180/Тема/брнат), 1 шт.; шкаф для документов (Т100+ТД12/Тема/плт/брнат), 1 шт.; шкаф для документов (Т404/13/0949+МТ1/13/0950/Тема/плт, 1 шт.; шкаф для документов, 1 шт.; шкаф для документов, 3 шт.; шкаф для документов, 2 шт.; шкаф для документов, 2 шт.	Республика Беларусь, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16	482,76	48,28	24,14
8	Холодильник МХ-2823-80, 1 шт.		41,40	4,14	2,07

В отношении вышеуказанных лотов проводятся шестые повторные торги. Стоимость снижена на 85 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 237 (29606) от 08.12.2021, стр.10, № 11 (29633) от 19.01.2022, стр. 10, № 37 (29659) от 24.02.2022, стр.6, № 52 (29674) от 17.03.2022, стр. 10, № 68 (29690) от 08.04.2022, стр. 15, № 79 (29701) от 23.04.2022, стр. 11

Дата и время проведения торгов	**27 мая 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и оплаты задатка	с 10.00 **11 мая 2022 года** до 15.00 **26 мая 2022 года**

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, СЗАО «ЛадаГарант», проводимых 27.05.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по Лоту № 1 – 5 % (пять процентов), по Лотам №№ 2–8 – 7,5 % (семь целых пять десятых процента) от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: +375 29 304 25 60, Андрей (по лотам №№ 2–8), +375 17 219 75 69, Дмитрий (по лотам №№ 1–8).**

Дополнительная информация по лоту № 1 – по тел. +375 29 305 86 50, Алена.

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Информация о продавце	**СЗАО «ЛадаГарант», 220014, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16) (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293953088 (Илья)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Лоевского районного потребительского общества (продавец) извещает о проведении 24 мая 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без НДС, бел. руб.	Сумма задатка 10 %, без НДС, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. № 340/С-290111 общей площадью 529,1 кв. м, наименование: ресторан «Ивушка», назначение: здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: холодная пристройка с отмосткой, асфальтобетонное покрытие 233,8 кв. м, дорожка из цементно-песчаной плитки 50,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 323055100004000006 площадью 0,2683 га по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г.п. Лоев, ул. Ленина, 32А	72 600,00	7 260,00
	Ограничение: договор аренды № 20-08/2019 от 20.08.2019 г.		

Продавец: Лоевское районное потребительское общество, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Ленина, 26А.

Контактные телефоны: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного фил. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

Лічбы і факты

БЯСПЕЧНАЯ ПРАЦА

Малако за шкоду, атэстацыя рабочых месцаў і аўтаматызацыя вытворчасці. Што яшчэ?

На працягу апошніх трох гадоў у Беларусі назіраецца зніжэнне вытворчага траўматызму: на 8 % — агульнага і больш як на 6 % — смяротнага. Пры гэтым летась на вытворчасці пацярпела 1886 чалавек, загінула — 132. Самыя траўманебяспечныя галіны ў Беларусі — прамысловасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва, транспартная дзейнасць. Пра небяспечныя прафесіі, шкодныя ўмовы працы, нулявы траўматызм і меры паляпшэння аховы працы расказалі эксперты.

ТЫДЗЕНЬ НУЛЯВОГА ТРАЎМАТЫЗМУ

Пытанням аховы працы трэба аддаваць увагу кожны дзень і нават кожную гадзіну, бо работнікі заўжды знаходзяцца ў рабочым працэсе і ў зоне, дзе з імі можа здарыцца няшчасны выпадак. Сёлетняя тэматыка Сусветнага дня аховы працы Міжнароднай арганізацыяй працы вызначана як задача «Агульнымі намаганнямі сфарміраваць пазітыўную культуру аховы працы», то-бок — працаваць над пытаннямі аховы працы сумесна з сацыяльнымі партнёрамі: прафсаюзамі, аб'яднаннямі наймальнікаў, дзяржавай, акцэнтаваў увагу **Ігар СТАРАВОЙТАЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.**

— У нашай краіне палітыка сумеснай работы з прафсаюзамі мае ўжо сур'ёзную гісторыю. У 2019-м Мінпрацы і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі заключылі пагадненне, згодна з якім мы сумесна вырашаем пытанні аховы працы. Летась, напрыклад, працавалі ў тым ліку і над удасканаленнем нарматыўна-прававой базы і прынялі шэраг рашэнняў, якія дапамогуць у будучым работнікам і наймальнікам вытрымліваць пытанні аховы працы.

«З 2016 года колькасць работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах, скарацілася больш як на 20 %. А ў параўнанні з 2021-м іх паменшала на 12 тысяч (0,7 %)».

Важная пастанова Саўміна датычыцца атэстацыі рабочых месцаў па ўмовах працы. Цяпер усе арганізацыі краіны незалежна ад формы работы, дзе работнікі працуюць у шкодных умовах працы, павінны праводзіць такую атэстацыю. Раней дадзенае пытанне было спрэчным. 21 верасня летась уступілі ў сілу Правілы па ахове працы № 53, якія вызначаюць міжгаліновыя патрабаванні і маюць вялікае значэнне для ўсіх галін. У новай рэдакцыі шмат змяненняў, і адно з асноўных — магчымасць весці дакументы па ахове працы ў электронным выглядзе, удакладніў Ігар Старавойтаў:

— Дакумент, які дапаможа мясцовым органам улады ў рэгуляванні пытанняў аховы працы, — рэкамендацыі Мінпрацы па фарміраванні тэрытарыяльных сістэм кіравання аховай працы. Сёлета ў красавіку ўнесены змяненні ў пастанову Саўміна № 260, што рэгулюе пытанні прадастаўлення работнікам, якія працуюць у шкодных умовах, малака. Не ўсе работнікі маглі піць малако, узнікалі цяжкасці з яго набыццём і захоўваннем. Цяпер замест малака работнікі змогуць атрымліваць кісель, чай ці іншыя харчовыя прадукты, якія больш зручна захоўваць і нават браць у камандзіроўку.

Летась у краіне запрацавала праграма «Рынак працы і садзейнічанне занятасці», дзе пытанням аховы працы прысвечана задача № 4. З мінулага года сталі прымяняць новыя падыходы. Упершыню арганізавалі «Тыдзень нулявога траўматызму», абазначыў намеснік міністра:

— Сутнасць яго ў тым, каб максімальна задзейнічаць усе рычагі ўвагі: наглядных і ідэалагічных органаў, грамадскага кантролю, прафсаюзаў, каб не дапусціць траўматызму ў гэты тыдзень. Сёлета ў краіне плануем зладзіць ужо два тыдні нулявога траўматызму ў кожным рэгіёне. У краіне тры раёны — Бешанковіцкі, Краснапольскі і Хоцімскі — на працягу года не дапускалі вытворчага траўматызму.

ТРЭЦЬ ЗАГІНУЛЫХ — МУЖЧЫНЫ СА СТАЖАМ ДА ГОДА

Тры чвэрці пацярпелых ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці (77,4 %) — мужчыны. У выніку здарэнняў інвалідамі летась прызнаныя 126 чалавек, 182 — канстатаваны пэўны працэнт страты працаздольнасці. Рэспубліканскі каэфіцыент частаты вытворчага траўматызму — колькасці асоб, якія атрымалі траўмы, на сто тысяч работнікаў — знізіўся з 49,1 да 49. Гэты каэфіцыент у сельскай гаспадарцы складае 132, а ў будаўніцтве — 117. Выходзячы з сезоннасці работ, цяпер у большасці абласцей аб'яўлены месячнікі бяспекі ў сельскай гаспадарцы, падзяліўся **Аляксандр СЕМІЧ, дырэктар дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Мінпрацы:**

— Большасць пацярпелых (фактычна кожны трэці) — мужчыны ад 51 да 60 гадоў. Прааналізаваўшы смяротны траўматызм, мы высветлілі, што 30 % загінулых летась мелі стаж работы па прафесіі да аднаго года. Значыць, не да канца адпрацаваны інструктаванне, навучанне і стажыроўкі работніка, якога выпускаюць у новую прафесію.

З іншага боку, 17,4 % загінулых маюць стаж 20 гадоў. Гэта, напэўна, іншая крайнасць — празмерная ўпэўненасць у сваіх уменнях, і тут гаворка пра забеспячэнне працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, падкрэсліў дырэктар дэпартамента. Ён нагадаў пра леташнія змяненні ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях, згодна з якімі ў кампетэнцыі ведамства — устанаўленне адміністрацыйнай адказнасці для работніка за парушэнне ім правілаў аховы працы. У большасці выпадкаў, калі работнік прызнаваў свае парушэнні і гэта было ўпершыню за год, дэпартамент выносіў папярэджанне. У краіне працуюць 80 тысяч інспектараў па ахове працы, якія за год выяўляюць больш як 400 тысяч парушэнняў.

Найбольш траўманебяспечныя прафесіі: кіроўца аўто, слесар, жывёлавод, падсобны рабочы, трактарыст. Траўмы яны атрымліваюць падчас рамонту траспартных сродкаў і прылад, а таксама падчас палявых работ. І адбываецца гэта з-за высокай долі ручной працы. Таму, дарэчы, тая ж аўтаматызацыя на малочна-таварных фермах павінна прывесці да зніжэння траўматызму, лічыць Аляксандр Семіч:

— Тым не менш, першы рубеж абароны бяспекі — сам супрацоўнік, які павінен не грэбаваць правіламі бяспекі. 22,2 % смяротных здарэнняў летась адбылося з-за таго, што работнікі парушылі правілы бяспекі.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ПРАЦЫ

Супрацоўнікі дэпартамента стараюцца знаходзіць новыя формы нагляду за выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб ахове працы. У прыватнасці, сёлета 28 лютага быў падпісаны Указ № 73, які ўносіць змяненні ва ўказы Прэзідэнта. Адна з нормаў гэтага дакумента ўзаконьвае новы від ажыццяўлення наглядной дзейнасці — правядзенне аглядаў аб'ектаў будаўніцтва на прадмет вытрымлівання патрабаванняў заканадаўства аб ахове працы, заўважыў дырэктар ведамства:

— Будаўнічыя аб'екты маюць спецыфіку — як правіла, тут працуе не адна арганізацыя, а некалькі. І праверка толькі адной з іх не дае эфекту, бо бяспека людзей, якія працуюць на аб'екце, можа забяспечвацца толькі ва ўзаемасувязі паміж генпадрадчыкам і субпадрадчыкам, то-бок аб'ект трэба правяраць цалкам. Раней у дэпартамента такога права не было. Як, калі і наколькі часта гэтыя праверкі, якія маюць прафілактычны характар, будуць праходзіць, пакуль вызначаецца. Калі па выніках такога мерапрыемства выяўленыя парушэнні своечасова выправяць, то меры адказнасці прымяняцца да суб'екта гаспадарання не будуць.

Яшчэ адна магчымасць зрабіць вытворчасць бяспечнай — знізіць колькасць работнікаў, якія працуюць у неспрыяльных умовах, лічыць **Іван КАРЧЭЎСКІ, начальнік упраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Мінпрацы.** Ва ўмовах, якія не адпавядаюць гігіенічным нарматывам, у краіне працуюць 748 тысяч чалавек (больш як 17 % ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы). 282 тысячы працуюць пры шуме, які перавышае нарматывы, а 310 тысяч — ва ўмовах фізічнай нагрузкі, якая перавышае дапушчальныя нормы.

— Штогод нам удаецца скарачаць колькасць людзей, якія працуюць у шкодных умовах, не менш як на 1 %, — адзначыў начальнік упраўлення. — Гэта дасягаецца за кошт удасканалення тэхналогій вытворчасці, замены састарэлага абсталявання сучасным, пераводу некаторых працэсаў на дыстанцыйнае кіраванне, прымянення аўтаматызаваных ліній. Усё, каб выключыць непасрэдны кантакт работніка са шкодным фактарам.

З 2016 года колькасць работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах, скарацілася больш як на 20 %. А ў параўнанні з 2021-м іх паменшала на 12 тысяч (0,7 %). Як прыклад — пераход на машынную нарыхтоўку драўніны, што амаль ліквідуе такія рызыкі як траўмаванне пілой ці дрэвам, а таксама ўкусы дзікіх пчол і звяроў. А на прадпрыемствах сувязі і інфарматызацыі адышлі ад многіх работ па спайцы кабеляў свінцом, перайшоўшы на оптавалакно. На жаль, змяненне тэхналогій не заўжды прыводзіць да значнага паляпшэння ўмоў працы. У сістэме аховы здароўя, напрыклад, па-сучаснаму абсталяваныя кабінеты для прамянёвай дыягностыкі па-ранейшаму вызначаюцца шкоднымі ўмовамі працы, дадаў спецыяліст. Таму эксперты паабяцалі і далей шукаць новыя шляхі для павышэння бяспекі працы.

Ірына СІДАРОК.

Класныя навіны

КАЛІ АДШУМЯЦЬ ВЫПУСКНЫЯ ВЕЧАРЫ?

Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года, і выпускных экзаменаў. Апошнія званкі для вучняў 9 і 11 класаў прагучаць 30 мая. Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў Міністэрства адукацыі рэкамендуе правесці 10 чэрвеня.

З 1 да 9 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены на II і III ступенях навучання.

Выпускнікі 11 класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (па выбары) і матэматыцы пройдуць 1, 3 і 6 чэрвеня. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца па радыё і тэлебачанні, а таксама размяшчацца на партале Міністэрства адукацыі. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на базавым і павышаным узроўнях, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па розных заданнях і тэкстах. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць вусны экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку пісьмова. Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 7 і 9 чэрвеня.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пры правядзенні выпускных экзаменаў у пісьмовай форме (за выключэннем выпускнога іспыту па матэматыцы) у класах інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца дзве экзаменацыйныя камісіі і выдзяляюцца два асобныя памяшканні для правядзення выпускных экзаменаў.

Выпускныя экзамены па вучэбных прадметах, якія праводзяцца ў пісьмовай форме, пачынаюцца ў 9 гадзін.

Для навучэнцаў 11 класаў, якія засвоілі ў поўным аб'ёме змест адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), арганізуецца кваліфікацыйны экзамен. Да яго дапускаюцца навучэнцы, якія выканалі ў поўным аб'ёме патрабаванні вучэбна-праграмнай дакументацыі, маюць выніковую адзнаку па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» не ніжэй за 3 балы, а пропускі заняткаў у іх не перавышаюць 30 працэнтаў гадзін за ўвесь перыяд навучання па прадмеце «Працоўнае навучанне».

Адзнака на кваліфікацыйным экзамене не ўплывае на адзнаку, выстаўленую ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне». Гадавая адзнака будзе выстаўляцца як сярэдняе арыфметычнае адзнак, атрыманых па выніках кожнай чвэрці. У атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі выстаўляецца гадавая адзнака па працоўным навучанні, атрыманая ў 11 класе.

Для адзінаццацікласнікаў, якія засвойваюць прафесіі, па якіх адукацыйны працэс можа быць арганізаваны без прысвоення разрада, калі аб'ём вучэбнага часу недастатковы для прысвоення разрада, кваліфікацыйны экзамен не праводзіцца, а навучэнцам выдаецца даведка аб навучанні.

Навучэнцам, якія паспяхова здалі кваліфікацыйны экзамен, выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору аб прысваенні кваліфікацыйнага разраду (класа, катэгорыі) па прафесіі.

Для ўсіх навучэнцаў невыпускных класаў навучальны год завяршаецца 31 мая.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму рэферэнту Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Івановай Наталлі Аляксандраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

ВАЙНА НЕ КАНЧАЕЦЦА З АБ'ЯЎЛЕННЕМ ПЕРАМОГІ

Яна адбіваецца не на адным пакаленні людзей

...Калі за плячыма больш за восем дзясяткаў гадоў, усяго, вядома ж, не ўспомніш і не раскажаш яшчэ і таму, што парушаецца паслядоўнасць, прыплятаюцца аповеды іншых людзей і — як ні круці — таксама становяцца ўспамінамі. З перажытага робяцца высновы...

Дзед мой Сяргей з бабуляй Агатай былі не з бедных, мелі «пагорак зямлі», нарадзілі больш за дзесяць дзяцей. Многія з іх памерлі малымі, а тыя, што выжылі — дочкі, нявесткі — пасля вайны засталіся ўдовамі. Так што з бацькавай радні я помню толькі цётак.

Ад іхды мамы што-нішто ведаю пра тату. Ён, як расказвалі, быў вельмі добрым, працаваў у краме і шмат што людзям даваў «на паверку»; дрэнна бачыў, таму ў войска яго не бралі. Аднак з пачаткам Фінскай вайны ён сам папрасіўся на фронт і стаў санітарам. Адзін з яго саслужыўцаў расказваў, што тату моцна параніла, калі ён ратаваў-перавязваў танкістаў з палаючага танка...

У пахаванцы паведамлялася месца пахавання. Але ж потым на ўсе свае запыты я атрымліваў адказ, што мясціны з такой назвай няма — ёсць з падобнымі, праўда, на помніках савецкім воінам прозвішча таты там не значыцца...

Маме тады было 27 гадоў, сястрычцы — восем, мне — усяго сем месяцаў. Мы засталіся без бацькі, а хутка і без жытла, бо згарэла хата. Гэта яшчэ да вайны.

Пра яе, праклятую, я помню зусім няшмат. Помню, што ў вёску (а яна была кіламетраў за дзесяць ад чыгункі) наязджалі і партызаны (нас, малых, яны каталі на веласіпедзе), і немцы. Тыя ігралі на губных гармоніках ды лавілі курэй.

Помню, фашыст адсек галаву маёй любімай «кубанцы», і я не ўтрымаўся — укусіў яго за нагу. Напэўна ж, не балюча, але немец схапіў мяне за каршэнь і пацягнуў да той самай калодкі... Бабуля, рызыкуючы жыццём, кінулася мяне ратаваць.

Калі партызаны ўзарвалі састаў непадалёк ад Фарынава, чуваць было аж у нашай вёсцы!

Адказам на гэта стаў тэрор: наляцелі самалёты, пачалася бамбёжка, вёска згарэла. Чорны дым тады рассцілаўся аж да самага лесу.

...Наша сям'я на нейкі час знайшла прытулак у вёсцы Касары.

Помню і жыццё ў лесе: вогнішчы, буданы, загарадкі для жывёлы, зробленыя з жэрдачак, прыбітых да дрэў...

Аднак фашысты знайшлі нас і там. Сагналі ў нейкі будынак у вёсцы Хоцевічы, сказалі, што спаляць. Жонка камандзіра партызанскага атрада, якая апынулася разам з намі, памкнулася ўцячы, і фашысты застрэлілі яе.

У гэты час мы з сястрычкай заплакалі, бо згубілі маму (потым даведаліся, што ад жаху яна запаўзла ў падпечча). Фашысты ж падумалі, што мы — дзеці той самай уцякачкі, і таксама пацягнулі нас да сценкі, каб расстраляць... Маміна сястра, цётачка Матрона, кінулася ім наперарэз з крыкам «Гэта мае дзеці!».

...Не ведаю чаму, але нас тады не спалілі, пагналі ў Полацк — без маці. Пра нас клапаціліся іншыя людзі — і родныя, і зусім чужыя: з рызыкай для жыцця яны перакідвалі праз агароджу хоць нешта з ежы, і тым самым ратавалі нас ад галоднай смерці.

Потым пачаўся адбор працаздольных для адпраўкі ў Германію. Тых, хто меў на руках дзяцей, пакідалі. Сярод нявольнікаў аказаўся мой родны дзядзька Ягор. Каб выратавацца, ён узяў мяне ў цёткі Матроны (у яе заставаўся свой Андрэйка і мая сястрычка Лілечка) і выдаў за свайго.

Помню яшчэ, што ўсе хварэлі. Помню, што многія паміралі і што вызвалілі нас савецкія войскі ў ходзе аперацыі «Баграціён».

Далей было жыццё ў зямлянцы з адзіным маленькім акенцам і земляной падлогай. Праўда, у хуткім часе нам як сям'і загінулага ў час вайны дзяржава дапамагла паставіць невялічкую драўляную хатку.

...Восенню 1945-га мне час быў ісці ў школу. Яе адкрылі ва ўцалелай хаце ў вёсцы Грыцкаўшчына. Памятаю, як нейкія дзядзькі пілавалі дошкі для нашых партаў. А першым дамашнім заданнем было прынесці цвікоў (мы рабілі іх з калючага дроту), каб гэтыя парты збіць.

Настаўнік быў адзін, і ўрок ён вёў адначасова для вучняў з першага да чацвёртага класа. Мы са стрыечным брацікам Андрэем сядзелі наперадзе, а на так званай галёрцы, за апошнімі партамі — былі амаль дарослыя дзецюкі.

На ўвесь наш першы клас быў адзін буквар, пісалі на газетах, замест чарніла карысталіся настоем з альховых шышак і бурачным сокам.

Што яшчэ ў памяці, дык тое, што з малых гадоў я цяжка працаваў. Паколькі ні коней, ні мужчын (з вайны вярнуўся толькі адзін, і той аднаногі) у вёсцы не было, у плуг запрагаліся жанчыны, а я ў свае шэсць-сем гадоў ужо араў.

Даручалі малым і шмат іншай работы. Я, напрыклад, пасвіў калгасных авечак, мой сябра — цялят. Часам, каб пабыць разам, мы (ведама, дзеці) сганялі два статкі ў адзін і потым, як той казаў, атрымлівалі па поўнай, бо авечкі дзе з'ядалі, дзе вытоптвалі траву, і цяляты заставаліся галоднымі.

Даставалася нам і за тое, што любілі катацца на баранах: нейкі з бадлівых ляціць на цябе, каб ударыць, а ты хапаеш яго за рогі, садзішся на спіну і... панёсся!

Пазней калгас стаў абзаводзіцца коньмі. Помню, адвозіў збожжа ад камбайна. Ссыпалася яно ў прымітыўную скрыню з дошак. Конь пры гэтым пужаўся, але ж справіцца з ім яшчэ можна было...

Аднак неяк, замест збожжа, мне ў скрыню ўкінулі штось з дэталяў ад сапсаванага камбайна: ад таго грукату конь, што называецца, «панёс», возам ударыўся ў памежны слуп, збіў кола, — я апынуўся пад скрыняй, і як не скалечыўся — не загінуў, не разумею дагэтуль!

Тануў неяк раз: малы, з зайздрасцю назіраў, як большыя хлопцы «стаяць» у глыбокай вадзе (нават узняўшы рукі!) — вырашыў паспрабаваць: адплыў на глыбокае, апусціў ногі ўніз і, можна сказаць, як той камень пайшоў на дно... Наглытаўся вады! Як выплыў, лепш не ўспамінаць.

І ў школу хадзіў з прыгодамі. У малодшых класах нас было шмат, і мы, каб адпудзваць ваўкоў, распальвалі своеасаблівую жароўню — у бляшанку клалі гуму, вугалле, смалякі... У старэйшыя класы я хадзіў адзін (іншыя вучобу кінулі, а малых за намі ўжо не было: бо пасля вайны дзеці амаль не нараджаліся)... Смешна сказаць — адпудзваў ваўкоў тым, што стукаў каменем аб камень.

Пасля школы таксама не лягчэй. Помню, што вельмі хацеў вучыцца. Што ў парванай целагрэйцы трое сутак ішоў у Мінск, што на хлеб з камсой зарабляў, разгружаючы (уручную) 60-тонныя пульманы дроў, што ледзь не да снегу начаваў пад елкамі і паступіў у вучылішча, дзе павінны былі карміць і адзяваць. А пакуль тое сталася, трое сутак жыў на вадзе — галадаў.

...Вучыўся заўжды толькі на выдатна, служыў таксама і гэтак жа здаў уступныя экзамены ў політэхнічны — паступіў на вячэрняе аддзяленне, хоць конкурс быў 10 чалавек на месца.

Потым была работа і досыць высокія заробкі, але я адмовіўся ад іх дзеля таго, каб вучыцца далей... Абараніў кандыдацкую. Выгадаваў, дапамог стаць на ногі чацвярым дзецям, пабудаваў дачу, дагэтуль працую — выкладаю ва ўніверсітэце інфарматыкі. І, азіраючыся назад, увесь час думаю, наколькі прасцей і лягчэй склаліся б лёсы мільёнаў дзяцей, калі б не вайна, калі б не загінулі бацькі. Як жа мне не хапала майго! Колькі ж разоў я, малы, заліваўся слязамі над адзінай яго фотакарткай!...

А як добра было б, калі б жывымі засталіся мае дзядзькі, калі б не згарэла вёска, калі б людзі не галадалі, не надрываліся ад непасільнай працы, калі б інвалідам не стала сястрычка...

Вайна ні ў якім разе не канчаецца з аб'яўленнем перамогі, яна адгукаецца, адбіваецца не на адным пакаленні людзей.

Іван Астроўскі,

г. Мінск.

Чалавек — чалавеку

ЯНА ХВАРЭЛА ЗА КОЖНАГА...

Як ёсць, так ёсць: менавіта ўвесну найбольш адчуваюцца страты дарагіх нам людзей, успамінаюцца іх тварыі і ўчынкі, перад вачыма праплывае перажытае — нават вельмі-вельмі даўно.

...Тады на дварэ была зіма. Я, малая і цяжка хворая, ляжала на ложку і не зусім разумела, чаму ў нашу хату сышліся гэтыя сумныя людзі, навошта нехта збіраецца запальваць свечку, чаму заплаканай матулі ўсе кажуць: «Ну што тут зробіш? Бог даў — бог узяў»?.. І раптам аднекуль рашучы голас: «Рана аддаяце... Яе ў бальніцу трэба! Чуеце? Мігам!»

Гэтак жа мігам мяняецца твар у мамы. Яна пачынае тупаць па хаце, укручваць мяне ў нейкія посцілкі-апраткі — выносіць на санкі.

З маім старэйшым братам-падлеткам яны цягнуць іх (і мяне) за два кіламетры да цэнтра брыгады, дзе не тое дзяжурны конюх, не тое вартаўнік выганяе ім найлепшага каня, аддае брату лейцы, і мы за дзесяць вёрстаў па лютым марозе імчым да бальніцы.

...На момант нашага прыезду галоўнага ўрача Варвары Іванаўны Кулікоўскай на месцы не аказалася, аднак з'явілася яна вельмі хутка: агледзела мяне, паставіла дыягназ (менінгіт), прызначыла лячэнне. На шчасце, у бальніцы знайшліся лекі, і я паступова стала папраўляцца. Да жыцця мяне вярнула менавіта Варвара Іванаўна. Яна, як потым расказвалі, хварэла за кожнага са сваіх пацыентаў!

Яшчэ казалі, што паходжаннем была з дваран і шчырых вернікаў, што захаплялася лоўляй рыбы...

Жыла, карацей, служыла людзям, і таму пасля смерці пакінула не толькі магілу ды невялічкі помнік, — пакінула добрую памяць у сэрцах людзей.

Ніна Бурко,

Бярэзінскі раён.

Весткі з месцаў

ПАМЯЦІ ІГНАТА ДАМЕЙКІ

Сёлета ў ліпені будзе адзначацца 220-годдзе з дня нараджэння Ігната Дамейкі — навукоўца, рэфарматара, сябра таварыства філаматаў, удзельніка паўстання 1830—1831 гадоў... У гонар гэтай даты краязнаўцы пасадзілі дубкі.

Восенню 1823 года Ігнат Дамейка быў высланы пад нагляд паліцыі ў вёску Жыбартоўшчына каля Дзятлава. Яму было забаронена паступаць на дзяржаўную службу і займацца грамадскай дзейнасцю. Тым не менш, на дзядзькавай сядзібе Ігнат Дамейка пачаў праводзіць доследы па вырошчванні жывёлы, вёў актыўную перапіску з сябрамі.

Цяпер зямля Жыбартоўшчыны належыць прадпрымальніку Канстанціну Шуляку. Ён таксама браў удзел у пасадцы дубкоў... Як і супрацоўнікі Дзятлаўскага краязнаўчага музея Алена Абрамчык, Вольга Цюшляева, краязнаўцы Валерый Петрыкевіч і Анатоль Альшэўскі. А ініцыятарам акцыі стаў Зміцер Юркевіч з Мінска, які займаецца вывучэннем жыцця і дзейнасці славутага земляка. У хуткім часе дубы ў гонар Дамейкі будуць пасаджаны і ў іншых мясцінах Гродзеншчыны.

Сяргей Чыгрын,
фота аўтара.

НАПІСАНАЕ — ЗАСТАЕЦЦА...

Гэты — 2022-і — год юбілеяў нашых славутых песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта ім, паэтам-праметэям, была прысвечана сустрэча ў Жырмунскім Цэнтры культуры і вольнага часу.

Гасцямі на ёй сталі старшакласнікі мясцовай школы, якія змаглі яшчэ раз акунуцца ў творчасць класікаў, паразважаць. У выкананні Карыны Зінчанкі і Ксеніі Клябан прагучалі вершы, урыўкі з паэм, Вікторыя Кашкевіч прачытала свой верш, прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння славутых пісьменнікаў, у творчасці якіх раскрыўся нацыянальны характар, выявілася незвычайная сіла беларускага слова. Напісанае сапраўды застаецца...

Зарына Васюкевіч,
бібліятэкар.

г. п. Воранава.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
11 мая 2022 г. № 17 (653)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ВЕЛЬМІ РАДАСНА, ШТО З НАМІ ЛЮДЗІ, ЯКІЯ АДВАЯВАЛІ МІР І СВАБОДУ

Уся краіна радуецца Дню Перамогі, не забываючы, што ў першую чаргу гэта свята тых, дзякуючы каму Вялікая Перамога стала магчымай. Віншаванні і падтрымка ветэранаў ліпнімі ніколі не бываюць. Члены Савета Рэспублікі пастаянна маюць стасункі са сваімі гераічнымі землякамі. А святочныя майскія дні — выдатная нагода яшчэ раз выказаць сваю падзяку і павагу да галоўных герояў Дня Перамогі. Таму ў насычаным графіку членаў Савета Рэспублікі знайшоўся час для сустрэчы з ветэранамі.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з франтавіком Іванам Васільевічам Сядовым. Іван Васільевіч прызваны ў Савецкую Армію ў 1944 годзе, быў стралком на 1-м Далёкаўсходнім фронце з Японіяй. Сёлета ветэран адзначае сваё 95-годдзе і 70 гадоў сямейнага жыцця са сваёй жонкай Верай Кузьмінічнай. І, безумоўна, адзначае чарговую гадавіну Вялікай Перамогі.

«9 Мая — вялікая дата для ўсіх нас. Дзень Перамогі адзначаецца ў кожнай сям'і. Мы ганарымся вамі. Нам вельмі радасна, што сёння з намі ўсё яшчэ ёсць людзі, якія перажылі тыя страшныя часы, адваявалі мір і свабоду. Ваш подзвіг, вашы гісторыі важныя для нас. Ваш прыклад для нас — гэта ўзор патрыятычнага стаўлення да сваёй краіны. Сёння мы бачым, як спрабуюць сказіць факты, перакроіць гісторыю. Але моладзь павінна ведаць гераічныя гісторыі свайго народа, памятаць подзвігі тых, хто аддаваў сваё жыцці дзеля нас, тых, хто жыве цяпер. Чым далей жыву, тым гэтае свята 9 Мая — больш баліць у мяне ў душы. Моладзь павінна гэта ўсё ведаць. Адна справа, калі ў кнізе напісана, а іншая справа, калі расказваюць ветэраны. У вас абпаленая вайной маладосць. Не было ў вас маладосці практычна», — заўважыла Наталля Качанава падчас сустрэчы з Іванам Васільевічам Сядовым. Яна пажадала герою моцнага здароўя і даўгалецця.

Сенатары сустракаліся з ветэранамі па ўсёй краіне, у кожным горадзе. **Член пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ** наведала ветэрана Філіпа Іванавіча Карлава, які жыве ў Жодзіне. Філіп Іванавіч удзельнічаў у знішчэнні Квантунскай арміі, узнагароджаны медалямі «За перамогу над Японіяй» і «За баявыя заслугі». Сенатар падарыла ветэрану мікрахвалевую печ і мультыварку.

У цэнтры ўвагі не толькі франтавікі, але і дзеці вайны, вязні канцэнтрацыйных лагераў. **Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей НЯВЕРАЎ** сустрэўся з Канстанцінам Іосіфавічам Мятлушкам, былым вязнем лагера «Азарычы». У лагеры ён захварэў на сыпны тыф. Пасля вайны дапамагаў у аднаўленні роднай краіны. Гэтым жа займаўся і пасля катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. «Мы памятаем, шануем, ганарымся подзвігам народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і хочам, каб нашы дзеці ведалі праўду пра тыя страшныя выпрабаванні, праз якія прайшлі нашы продкі. Важна падтрымліваць гэтых людзей усімі магчымымі спосабамі», — адзначыў Аляксей Няверауў.

А член **Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна АБЕЛЬ** наведала ветэрана працы Марыю Іванаўну Зянькову. Марыя Іванаўна — дзіця вайны, сваё маленства яна правяла на акупаванай фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі. «Вайна — гэта жахлівы час для кожнага. Не ўсе дарослыя змаглі знайсці ў сабе сілы спакойна жыць, пераносны пакуты вайны. Дзеці вайны — асаблівая катэгорыя. Яны не зламаліся і сваёй працай набылі сабе пашану і павагу. Сёння гэтыя героі — прыклад для нас. А мы павінны памятаць пра іх подзвіг і дапамагаць ім усім неабходным», — адзначыла сенатар.

Члены Савета Рэспублікі аддалі сваю даніну павагі не толькі жывым сведкам вайны, але і тым, хто пайшоў з жыцця. **Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Алена ЗЯБЛІКАВА** правяла мітынг-рэквіем каля брацкай магілы ў аграгарадку Стара-Барысаў. Удзел у мерапрыемстве ўзялі школьнікі і прафсаюзны актыў горада Барысава.

«Мы ніколі не павінны забывацца на тыя гераічныя ўчынкі, якія здзяйснялі нашы бацькі і дзяды ў імя свабоды і незалежнасці. Мы любім сваю Радзіму і павінны быць вартыя тых, хто не вярнуўся дадому ў тысяча дзевяцьсот сорак пятым, хто падняў краіну з руін і попелу. Мы кажам вам, дарагія нашы ветэраны, дзякуй за мужнасць, адвагу, гераізм. Няхай неба над нашымі галовамі заўсёды застаецца чыстым, светлым, а звонкі і радасны смех дзяцей напаўняе жыццё шчасцем», — адзначыла сенатар у сваім выступленні.

У мітынгу-рэквіеме каля мінскага мемарыяла «Памяць» паўдзельнічала і старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец. Па яе словах, памятаць аб подзвігу, які здзейсніў наш народ у гады вайны, — гэта святы абавязак кожнага з нас. «У Беларусі невыпадкова 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Як сказаў наш Прэзідэнт, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, уся Беларусь — гэта жывы помнік той вайне. І сапраўды, кожны куток нашай Радзімы захоўвае памяць аб подзвігу і мужнасці ўсіх, хто змагаўся на беларускай зямлі плячо ў плячо за свабоду, за нашу будучыню», — падкрэсліла сенатар.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Савета Рэспублікі.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Нягледзячы на свята, работа кіпіць

Расказваем асноўныя навіны мінулага тыдня з Савета Рэспублікі

• Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар «Белпалівагаза» Аляксей Кушнарэнка наведаў аб'екты «Віцебскаблгаза». Сенатар пазнаёміўся з работай прадпрыемства. Аляксей Кушнарэнка таксама павіншаваў калектыў прадпрыемства з перамогай у галіновым вытворчым спаборніцтве на званне «Найлепшая газазабеспячальная арганізацыя па выніках 2021 года» і ўручыў генеральнаму дырэктару УП «Віцебскаблгаз» Пятру Шэршню пераходны Кубак.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы ўзяў удзел у пасяджэнні Пінскага раённага выканаўчага камітэта. Разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Пінскага раёна за I квартал 2022 года, пытанні зніжэння індэкса фізічнага аб'ёму прамысловай вытворчасці, інавацыйнай прадукцыі. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі далейшыя перспектывы развіцця прадпрыемства, меры па забеспячэнні якаснага і своечасовага будаўніцтва свінакомплексу ў вёсцы Вялікія Дзіковічы.

• Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо з рабочым візітам наведаў Узбекістан. Візіт адбыўся ў рамках супрацоўніцтва з Рэспубліканскім спецыялізаваным навукова-практычным медыцынскім цэнтрам хірургіі імя В. Вахідава. Сенатар азнаёміўся з работай цэнтра і правёў сумесную аперацыю па трансплантацыі печані аднаму з пацыентаў. Таксама падчас візіту Алега Румо было падпісана пагадненне аб наступным супрацоўніцтве ў галіне высокатэхналагічнай медыцыны, развіцця транспланталогіі і лячэння пацыентаў з цяжкімі пашкоджаннямі печані.

МЕРКАВАННІ

Час казаць праўду аб той вайне

Члены Савета Рэспублікі выказалі свае думкі наконт не заўсёды адэкватных адносін некаторых краін да Дня Перамогі. **Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** нагадаў, што краіна, якая не памятае сваёй гісторыі, не мае права на будучыню. «Палітыка, якая сёння праводзіцца з мэтай сцерці памяць аб тых подзвігах, аб тых шматлікіх ахвярах, якія былі пакладзены на алтар перамогі над нацызмам, вядзе да расчалавечвання, да зніжэння каштоўнасці чалавечага жыцця. Гэта просты шлях да чарговых глабальных канфліктаў, шматлікіх чалавечых ахвяр і апускання свету ў хаос, супрацьстаянні і войны. Мы павінны, выкарыстоўваючы ўвесь наяўны ў нас арсенал, гэтаму актыўна процідзейнічаць», — падкрэсліў сенатар.

А **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** адзначыў, што ў Год гістарычнай памяці неабходна падкрэсліваць, што беларусы памятаюць аб ахвярах, пакладзеных на алтар Перамогі. «А што да заходніх краін, таго вандалізму, які сёння адбываецца ў Еўропе, то яны не памятаюць сваёй гісторыі, яны не забываюць і сваімі дзеяннямі наносяць сабе ўрон. Яны маральна і духоўна нявечаць будучыні пакаленні сваіх краін, якія могуць апынуцца ў такой сітуацыі, калі ім не працягнуць руку дапамогі, як гэта зрабілі дзяды і прадзеды ў той страшнай вайне. Той цынізм, з якім гэта сёння робіцца, — гэта нявартая палітыка», — падкрэсліў ён.

Сенатар акцэнтаваў увагу на прынятыя ў Беларусі законы «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» і «Аб генацыдзе беларускага народа». «Час казаць праўду аб вытоках той вайны, аб трагедыях той вайны», — канстатаваў Сяргей Рачкоў.

Валерыя СЦЯЦКО.

«ГАЛОЎНАЕ — ТВАЯ КРАІНА, І ТЫ ПАВІНЕН ТУТ РАБІЦЬ УСЁ, КАБ ЗАХАВАЦЬ

Беларускі шлях — эвалюцыйнае развіццё

— Паважаная Наталля Іванаўна, 4 мая адбылося трэцяе пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі. На яе адкрыцці вы адзначылі, што Дзень Канстытуцыі ў 2022 годзе набыў асаблівыя статус, ролю і значэнне. Што пад гэтым вы мелі на ўвазе?

— Сапраўды, 15 сакавіка 2022 года мы адкрылі не толькі восьмую сесію Савета Рэспублікі, але і, па сутнасці, пачалі новы этап развіцця беларускага дзяржаўнага будаўніцтва і айчыннага парламентарызму. Значэнне гэтай падзеі ў сучаснай гісторыі нашай краіны цяжка пераацаніць.

Справа ў тым, што, як мне здаецца, за апошні час мы, беларусы, сталі лепш разумець працэсы, якія адбываюцца, і мацней шанаваць тое, што маем. Мы ўбачылі, што адбываецца ў свеце — усё тое, пра што казаў наш Прэзідэнт, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, пра геапалітычную перабудову і псеўдакаштоўнасці, якія спрабуе навязаць усім калектыўны Захад, сапраўды, выйшла на паверхню. І мы прыкметна пасталелі як нацыя.

> Напэўна, з прычыны нашага менталітэту мы недастаткова гаворым аб тым, якая цудоўная наша краіна. Мы, беларусы, досыць сціплыя людзі, а трэба было б больш паказваць, каб людзі разумелі — нам ёсць чым ганарыцца! Добрыя справы трэба паказваць больш, каб усе разумелі, што маюць, і шанавалі тое.

Таму, актыўна ўключаючыся ў грамадскія абмеркаванні праекта і пасля, прыйшоўшы на рэспубліканскі рэферэндум, людзі падтрымалі не толькі прапанаваныя навацыі ў Асноўны Закон. Перш за ўсё мы выступілі ў абарону нашай Айчыны, міру і спакою на беларускай зямлі. Беларусы выбралі шлях эвалюцыйных стваральных пераўтварэнняў.

На самай справе лічба «83 працэнты» сведчыць пра вельмі многае: пра тое, што беларусы — гэта адзіная і суцэльная нацыя, што па ўсіх асноўных пытаннях развіцця краіны ўлада і грамадства слухаюць і чуюць адно аднаго, што нашы грамадзяне падзяляюць і падтрымліваюць палітычны курс, які праводзіцца кіраўніцтвам краіны... Усё гэта значыць, што на пытанне нашага Прэзідэнта: «Ці гатовыя вы плаціць за суверэнітэт і незалежнасць?» беларускі народ адказаў сцвярджальна. Гэта архіважна для будучыні Беларусі.

Таму, безумоўна, у 2022 годзе Дзень Канстытуцыі, калі прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме навацыі ўступілі ў сілу, стаў асаблівым. Гэтая дата — не проста дзяржаўнае свята, гэта дзень па-сапраўднаму блізкі кожнаму, хто любіць Беларусь і жадае нашай краіне далейшага развіцця і росквіту.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Дзяржава — сама па сабе каштоўнасць

— На ваш погляд, якую ролю ў нацыянальным сталенні беларускага грамадства адыгралі падзеі 2020 года? Як тая сітуацыя ўспрымаецца вамі сёння?

— Няма ніякага сумнення, што мы сапраўды маглі страціць сваю краіну. Усё стала відавочным менавіта ў жніўні 2020 года, калі Беларусь падверглася масіраванай гібрыднай атацы звонку. Тое, што адбывалася, было выразна спланавана супраць незалежнасці, суверэнітэту і 30-ці гадоў дасягненняў нашай краіны.

Мы пераканаліся ў гэтым не толькі на ўласным вопыце, але

і на прыкладзе іншых краін. Гісторыя неаднаразова вучыла нас: паглядзіце — што магло б быць з нашай краінай. Але ведаеце, жыццё паказвае, што, напэўна, гэта павінна было адбыцца — ва ўсялякім выпадку, мы даведаліся, хто чаго варты і хто ёсць хто.

Гэтыя падзеі паказалі, наколькі выразна выбудаваная сістэма ўлады, якая не дазволіла знішчыць беларускую дзяржаўнасць, што значыць прэзідэнцкая рэспубліка і моцны Прэзідэнт — лідар сваёй краіны і нацыі.

Наш кіраўнік дзяржавы — гэта на самай справе той чалавек, вакол якога ў цяжкую хвіліну з'ядналіся ўсе, хто разумеў, што за гэтым стаіць. Таму што ў нас народны Прэзідэнт — гэта праўда. Ён той чалавек, які бязмерна любіць сваю краіну, свой народ і робіць усё для захавання міру, спакою і суверэнітэту Беларусі.

Таму ніякіх страхаў асабіста ў мяне тады не было. Я не магла ўявіць і паверыць, што краіна можа быць разбурана. У душы ў мяне не было ніякіх сумненняў — усё будзе добра. Я разумела: нам трэба жыць і працаваць, як мы жылі і працавалі да гэтага.

> Разумееце, калі ў чалавека ёсць у жыцці свае асновы і перакананні, яму лягчэй жыць. Хай на нейкім этапе цяжка, наогул немагчыма... Але ў цябе ёсць жыццёвыя асновы, якія ты ніколі не аддасі, таму што самае страшнае — жыць не ў ладах з сабой і сваім сумленнем.

Хоць даводзілася і расчароўвацца ў некаторых людзях, якім давяраў і ў якіх быў упэўнены, што яны адданыя сваёй краіне, народу, Прэзідэнту. Мне шчыра шкада такіх людзей. У іх няма стрыжня і якасцяў, уласцівых нармальнаму чалавеку: сумленнасці, прыстойнасці, пачуцця справядлівасці, любові і адданасці. Людзі, здольныя на здраду, — агідныя, не больш за тое.

Разумееце, калі ў чалавека ёсць у жыцці свае асновы і перакананні, яму лягчэй жыць. Хай на нейкім этапе цяжка, наогул немагчыма... Але ў цябе ёсць жыццёвыя асновы, якія ты ніколі не аддасі, таму што самае страшнае — жыць не ў ладах з сабой і сваім сумленнем. Я заўсёды думала: «Як гэтыя людзі могуць?». Я, напрыклад, гэтага не разумею. Але разумею і іншае: сваё меркаванне не навяжаш і не ўставіш у галаву іншага чалавека.

Напэўна, з прычыны нашага менталітэту мы недастаткова гаворым аб тым, якая цудоўная наша краіна. Мы, беларусы, досыць сціплыя людзі, а трэба было б больш паказваць, каб людзі разумелі — нам ёсць чым ганарыцца! Добрыя справы трэба паказваць больш, каб усе разумелі, што маюць, і шанавалі тое.

Жылі і жыць будзем!

— Спроба дзяржаўнага перавароту правалілася, але калектыўны Захад працягвае гібрыдную вайну супраць нашай краіны, і адзін з упадабаных метадаў — санкцыйны ціск. Насуперак санкцыям беларуская эканоміка, паводле статыстыкі, дэманструе рост. Гэта парадокс ці дакладна выбудаваная эканамічная палітыка?

— Не, гэта не парадокс, а вынік работы, калі ўсе разумеюць, што трэба рабіць. Прэзідэнт выразна паставіў задачу ўраду: нашы людзі не павінны адчуць на сабе санкцый, і ўрад прымае абсалютна вывераныя і дакладныя крокі, каб забяспечыць эканамічны рост у нашай краіне. Як сказаў кіраўнік дзяржавы: «Нам трэба не проста выжыць — трэба развівацца».

А гэта задачы, якія задоўга да санкцыйнага ціску ставіліся Прэзідэнтам: імпартазамяшчэнне, дыверсіфікацыя экспарту, развіццё рэгіёнаў... Неаднаразова пра гэта гаварылася: мы павінны працаваць з усімі і знаходзіць шляхі для рэалізацыі сваёй прадукцыі, выпускаць тое, што сёння запатрабавана на рынку, мець усё сваё, забяспечваць харчовую бяспеку.

> Гісторыя неаднаразова вучыла нас: паглядзіце — што магло б быць з нашай краінай. Але ведаеце, жыццё паказвае, што, напэўна, гэта павінна было адбыцца — ва ўсялякім выпадку, мы даведаліся, хто чаго варты і хто ёсць хто.

Што няправільна? Сёння мы маем усё і можам жыць аўтаномна, самастойна, забяспечваючы сваю харчовую бяспеку і яшчэ пастаўляючы на экспарт прадуктаў харчавання на шэсць мільярдаў долараў. Таму ўсе задачы, якія дазвалялі б краіне жыць нармальна і развівацца, пастаўлены не сёння і не ўчора, і не тады, калі да нас пачалі прымяняць санкцыі. Паўсвету жыве пад санкцыямі, і мы да іх ужо прывыклі.

Наша Канстытуцыя — унікальная

— Вяртаючыся да тэмы канстытуцыйных пераўтварэнняў: Асноўны Закон замацоўвае паўнамоцтвы Старшыні Савета Рэспублікі фактычна на ўзроўні другой асобы ў дзяржаве. Ці ўспрымаеце вы дадзеную навацыю як павышэнне адказнасці, ускладзеную асабіста на вас?

— Канстытуцыйныя паўнамоцтвы павінны праецыравацца на пасады і ні ў якой меры на канкрэтныя персаналіі. Гэта справядліва і для паўнамоцтваў, якія ўскладаюцца на кіраўніка верхняй палаты парламента ў выпадку наступлення пэўнай сітуацыі да правядзення прэзідэнцкіх выбараў.

Тым і ўнікальная наша Канстытуцыя, што ствараўся гэты дакумент не пад асобы, а пад сістэму дзяржаўнай улады і кіравання, якая функцыянуе ў нашай краіне.

Калі ў прэм'ер-міністра будуць сканцэнтраваны ўсе ўладныя функцыі, то наколькі гэта службовая асоба можа заставацца незалежнай у прыняцці рашэнняў? У той жа час Старшыня Савета Рэспублікі — гэта кіраўнік прадстаўнічага органа, галоўнымі задачамі якога з'яўляюцца ўхваленне законапраектаў, удзел у іх далейшай рэалізацыі і работа з насельніцтвам. І таму гэта абсалютна правільнае рашэнне.

Усё найлепшае для нас — у нашых традыцыях

— Праз вас як намесніка старшыні Канстытуцыйнай камісіі, члена рабочай групы па дапрацоўцы праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь прайшло мноства прапаноў. Якія нова-ўвядзенні найбольш блізкія асабіста вам?

— Многія змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон мне блізкія: аб духоўных і маральных каштоўнасцях у прэамбуле, аб захаванні гістарычнай памяці, аб шлюбе як саюзе мужчыны і жанчыны — здавалася б, трывіяльна, але замацоўвае традыцыйныя для беларускага грамадства падыходы.

У Канстытуцыі найвышэйшы орган народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь — Усебеларускі народны сход. Некаторыя кажуць: «У нас ёсць парламент, гэта будзе

ТВОЙ НАРОД, ТВАЯ ЗЯМЛЯ. ШТО АД ЦЯБЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ, МІР І СПАКОЙ»

другі парламент». Адкажу: «Не!». У іх абсалютна розны функцыянал. Нацыянальны сход — Савет Рэспублікі і Палата прадстаўнікоў — працуе перш за ўсё над законапраектамі. А гэты дзяржаўны орган будзе стабілізацыйным, самыя дастойныя людзі будуць з'яўляцца дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу.

Тым больш што такая форма зарэкамендавала сябе вельмі добра: бо і першы, і шосты Усебеларускі народныя сходы праходзілі ў вельмі няпростых умовах. Першы — калі краіну трэба было адвесці ад прорвы і па ініцыятыве Прэзідэнта сабралі гэты сход, былі прыняты рашэнні, якія дазволілі перажыць палітычны крызіс, што меў месца ў той час, прыняты выразныя ўстаноўкі па развіцці нашага грамадства. Наступныя чатыры сходы мелі сацыяльна-эканамічную накіраванасць. У цэнтры ўвагі шостага сходу былі пытанні не толькі сацыяльна-эканамічнага развіцця, але і грамадска-палітычнага становішча ў нашай краіне.

Таму надзяленне Усебеларускага народнага сходу канстытуцыйным статусам — вельмі важная навела. Такога інстытута ўлады няма нідзе, але я думаю, ён спрацуе эфектыўна.

> У 2022 годзе Дзень Канстытуцыі, калі прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме навацыі ўступілі ў сілу, стаў асаблівым. Гэтая дата — не проста дзяржаўнае свята, гэта дзень па-сапраўднаму блізкі кожнаму, хто любіць Беларусь і жадае нашай краіне далейшага развіцця і росквіту.

Акрамя таго, Савет Рэспублікі — ініцыятар з'яўлення асобнага «маладзёжнага» артыкула, бо мы разумеем, наколькі важна сёння працаваць з моладдзю. Што датычыцца дзейнасці Нацыянальнага сходу, мы ўнеслі прапанову па ўвядзенні адной сесіі ў год, каб парламентарыі маглі працаваць практычна цэлы год і аператыўна прымаць законы. Як бачым, такі фармат дзейнасці выніковы.

Законы — ад жыцця

— Наталля Іванаўна, вы — вельмі шчыры і адкрыты чалавек. Людзі гэта адчуваюць і заўсёды імкнуцца трапіць на асабісты прыём менавіта да вас. Тысячы зваротаў і жыццёвых гісторый... З якімі пытаннямі прыходзяць грамадзяне да прадстаўнікоў улады і якім чынам гэтыя пытанні вырашаюцца?

— Я неаднаразова казала пра тое, што, наведваючы той ці іншы рэгіён, можна вызначыць найбольш актуальныя пытанні ў кожным з іх: у адным гэта можа быць працаўладкаванне, у іншым — добраўпарадкаванне, у трэцім — яшчэ нешта. Але апошнім часам прыходжу да высновы, што самае галоўнае, каб чалавек, да якога звяртаюцца людзі, мог кваліфікавана падказаць і дапамагчы. У Савет Рэспублікі паступае дастаткова шмат зваротаў, калі не так пракансультавалі ў частцы пенсіённага забеспячэння, архітэктуры і будаўніцтва, пастаноўкі на чаргу ў паляпшэнні жыллёвых умоў тых, хто мае ў гэтым патрэбу... Гаворка пра тое, што кадры на месцах павінны быць высокапрафесійнымі. Жыццё змяняецца — змяняецца заканадаўства, усё трэба своечасова вывучыць, каб правільна падказаць людзям і дапамагчы ім у вырашэнні іх пытанняў.

Дарэчы, ні ў адной краіне свету няма такой выразна выбудаванай сістэмы работы з людзьмі, як у нашай, калі чалавек можа звярнуцца, куды ён палічыць патрэбным.

Што датычыцца традыцыйных пытанняў, з якімі звяртаюцца людзі, то звычайна гэта добраўпарадкаванне. Дастаткова шмат пытанняў па зямельных участках для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, да якіх дадаюцца міжасобасныя адносіны. Ёсць пытанні, што датычацца судовай улады: некаторыя людзі лічаць, што несправядліва паставіліся да іх сваякоў, блізкіх, але, як правіла, колькі мы займаемся такімі пытаннямі, усе рашэнні былі раней правамерна прынятыя.

> Тым і ўнікальная наша Канстытуцыя, што ствараўся гэты дакумент не пад асобы, а пад сістэму дзяржаўнай улады і кіравання, якая функцыянуе ў нашай краіне.

Дарэчы, прыёмы па асабістых пытаннях і сустрэчы з людзьмі важныя для нас, таму што мы працуем з законамі. Калі мы разглядаем той ці іншы законапраект, мы ведаем, дзе ёсць праблемы і на што неабходна звярнуць увагу. Напрыклад, цяпер мы займаемся праектам указа па зямлі, і я адразу згадваю пытанні, з якімі да мяне звярталіся грамадзяне: магчымасць будаўніцтва яшчэ аднаго жылога дома на выдзеленым участку, калі ў доме жыве некалькі сем'яў і яны маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і шмат іншых пытанняў, якія ідуць ад жыцця. Таму, чым больш мы ведаем інфармацыі ад людзей, тым лягчэй працаваць над праектамі законаў і іншых нарматыўных прававых актаў.

Кожны ў адказе за сваю краіну

— Мы ўжо закранулі тэму захавання гістарычнай памяці. На жаль, сёння ў заходнім свеце, у некаторых постсавецкіх краінах назіраюцца спробы рэабілітацыі нацызму. Мы замацавалі неабходнасць захавання гістарычнай памяці ў Асноўным Законе краіны. Ці дастаткова гэтага?

— Замацаваўшы нормы аб неабходнасці захавання гістарычнай памяці ў Канстытуцыі, мы разумеем, што гэта базіс, на якім павінна выбудоўвацца і патрыятычнае выхаванне моладзі, і выхаванне грамадства ў цэлым. У ходзе адной з прамых тэлефонных ліній па гэтай тэме да мяне звярнулася жанчына паважнага ўзросту і сказала вельмі мудрую думку: «Найлепшы выхавальнік — гэта патрэба». І гэта сапраўды так. Людзі, якія перажылі вайну і пасляваенны час, жылі вельмі сціпла, цяжка працуючы. Але яны былі шчаслівыя тым, што не ляцяць бомбы на іх галовы, не рвуцца снарады і можна жыць спакойна. Потым па меры ўзрастання матэрыяльнага дастатку і сацыяльнага дабрабыту ўсё пачынае ўспрымацца крыху па-іншаму.

> Надзяленне Усебеларускага народнага сходу канстытуцыйным статусам — вельмі важная навела. Такога інстытута ўлады няма нідзе, але я думаю, ён спрацуе эфектыўна.

І каб не было паўтарэння тых жахаў, нягод і страт, якія перажылі папярэднія пакаленні, людзі павінны кожны раз востра адчуваць: гэта — не данасць раз і назаўжды, у любую хвіліну можа стаць па-іншаму. Для любога чалавека самае страшнае — гэта вайна. Тады не думаеш ні аб набыцці машыны, ні аб будаўніцтве кватэры, ні аб якіх іншых выгодах... Тады ўжо нічога таго не трэба.

Калі сёння фальсіфікацыя і фэйкі запаланілі ўсё і даступнасць інфармацыі такая, што кнігі чытаць многія не хочуць, у музей схадзіць ім таксама няма калі, а за ўсё хуткэй і прасцей паглядзець навіны ў мабільным тэлефоне і ўспрыняць іх за праўду. Але праўда не ў гэтым. Праўда ў тым, каб памятаць і шанаваць людзей, якія загінулі, адстойваючы свабоду і незалежнасць нашай краіны.

Калі я распавядала сваёй чатырохгадовай унучцы пра вайну, яна казала: «Бабуля, я люблю слухаць пра вайну, але толькі мне чамусьці заўсёды хочацца плакаць». Я ёй адказвала: «Добра, што табе хочацца плакаць. Значыць, ты разумееш, як гэта дрэнна і страшна».

Трэба пастаянна нагадваць людзям, што чалавечае жыццё — нецэннае. У дадзеным кірунку патрэбна яшчэ вялікая, сур'ёзная работа. Пра гэта нельга забываць.

Акрамя таго, з намі яшчэ ёсць ветэраны, якія з'яўляюцца сведкамі той страшнай вайны. І праўду, якую яны даносяць да нас, мы абавязаны перадаваць. Яшчэ пройдзе нейкі час, і з намі не будзе гэтых людзей. Таму мы павінны вучыцца на гістарычных падзеях і фактах, якія пражыў наш шматпакутны народ. Інакш мы перастанем разумець, што кожны ў адказе за сваю краіну.

Не адзін ці два, ці дзясятак людзей, якія кіруюць краінай, — мы ўсе павінны разумець адказнасць за будучыню сваёй краіны. Тады гэта дасць вынік. Адсюль і мітынгі-рэквіемы, і наведванні музеяў, і вахты Памяці, якія нясе моладзь і ганарыцца гэтым. Аб усім гэтым трэба казаць і рабіць усё для ўсведамлення кожным, што самае галоўнае — гэта твая краіна, мір і спакой у ёй.

Вялікае свята — Дзень Перамогі

— Ёсць падзеі, даты, імёны, якія ўвайшлі ў гісторыю кожнага горада, вёскі, краю, краіны і нават у гісторыю ўсёй Зямлі. У гэтыя дні ўсёй краінай мы святкуем 77-ю гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Што б вы хацелі сказаць нашым ветэранам, цяперашняму пакаленню беларусаў, моладзі?

— Дзень Перамогі — гэта сапраўды ўсенароднае свята, і ў Год гістарычнай памяці ён набывае асаблівае значэнне. Гэта светлы дзень, але, разам з тым, чым далей мы ад гэтай даты, тым больш кранальнай яна становіцца для кожнага з нас, тым большы водгук у нашых сэрцах знаходзіць памяць аб той страшнай трагедыі, якая адбылася на нашай зямлі.

> Сёння мы маем усё і можам жыць аўтаномна, самастойна, забяспечваючы сваю харчовую бяспеку і яшчэ пастаўляючы на экспарт прадуктаў харчавання на шэсць мільярдаў долараў.

І абсалютна правамерна Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка сказаў, што наша Беларусь — гэта помнік той вялікай вайне.

Светлая памяць аб тых людзях, якія адстаялі свабоду і незалежнасць нашай краіны, захаваецца ў нашых сэрцах. Нізкі паклон усім тым, хто сёння разам з намі, нізкі паклон тым, хто злажыў галовы за свабоду і незалежнасць нашай краіны, хто не дазволіў нацызму ўзяць верх і дзякуючы каму мы сёння жывём пад мірным небам. Мы павінны памятаць гэты подзвіг. І мы будзем памятаць. Наш святы абавязак — захоўваць гістарычную памяць аб гераічным мінулым беларускага народа і перадаваць яе з пакалення ў пакаленне.

Вольга АНУФРЫЕВА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ВЫСЛУХАЛІ ЛЮДЗЕЙ І ПАВІНШАВАЛІ ВЕТЭРАНАЎ

Адзіны дзень прыёму, які сенатары правялі ў Магілёўскай вобласці, быў адзначаны і вялікім святам Перамогі

Падчас адзінага прыёму грамадзян, што сенатары правялі ў Магілёўскай вобласці ў апошнюю сераду красавіка, адбыліся і сустрэчы некаторых з іх з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Напярэдадні 77-й гадавіны Перамогі яны віншавалі былых франтавікоў, відавочцаў страшных падзей са святам і ўручалі падарункі. Разам са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай парламентарыі наведвалі таксама месцы смутку, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай. Спікер верхняй палаты парламента неаднаразова падкрэслівала, як важна памятаць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і рабіць усё, каб захаваць мір. Яна заклікала сваіх калег, прадстаўнікоў усіх узроўняў улады, адказных асоб, што працуюць са зваротамі грамадзян, быць уважлівымі да праблем насельніцтва, цікавіцца настроем людзей, праяўляць у адносінах да іх клопат і павагу.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Сяргей АНЮХОЎСКІ сустрэўся ў гэты дзень у Слаўгарадзе з былой вязніцай Антанінай Міхайлаўнай Аўдзеенкай. Лёс у жанчыны сапраўды цяжкі і пакручасты. Яна нарадзілася за год да вайны, а ў 1941-м на свет з'явілася яе малодшая сястрычка Валянціна. Бацьку прызвалі на фронт, а маці засталася адна з маленькімі дочкамі на руках. Акупанты вывезлі жанчыну з дзецьмі ў Германію. Там яе прымусілі працаваць на фабрыцы, а малыя заставаліся практычна адны, як той казаў, у холадзе і голадзе. Было цяжка, але выжылі. Пасля вайны ім дапамаглі вярнуцца на радзіму, у хуткім часе прыйшоў з фронту і бацька. Ён увесь час пакутаваў ад ран, з цяжкасцю перамяшчаўся, бо адна нага была пастрэлена. Антаніна Міхайлаўна прызнаецца, што сёння яна ўвагай не абдзелена. Атрымлівае да Дня Перамогі і віншаванні, і падарункі. Урачысты прыём для былой вязніцы мясцовыя ўлады арганізавалі ў сценах Слаўгарадскага гісторыка-краязнаўчага музея. Пасля таго як сенатар павіншаваў яе з надыходзячым святам і ўручыў падарункі, адбылася экскурсія па музейных залах.

— Клопат пра такіх людзей — вельмі важная частка нашай работы, — падкрэсліў сенатар. — Яны пражылі нялёгкае жыццё, мы ж павінны зрабіць так, каб яны ні ў чым не адчувалі патрэбы.

Сяргей Анюхоўскі звярнуў увагу на тое, што падчас прыёму грамадзян у Слаўгарадзе прыйшло няшмат людзей. На яго думку, гэта прыкмета таго, што ўлады тут працуюць добра і папярэджваюць спрэчныя сітуацыі.

— Традыцыйна хвалююць насельніцтва пытанні па ЖКГ, транспарце, дарогах. Адны праблемы вырашаюцца на працягу таго ж дня, калі паступілі, для вырашэння іншых патрэбны час. Ёсць пытанні, якія датычацца зямельных участкаў, калі суседзі не могуць дамовіцца, дзе павінна праходзіць мяжа. І тады яны пачынаюць уцягваць у гэты канфлікт трэціх асоб. Прыходзіцца шукаць выйсце разам, — кажа сенатар.

Вельмі парадавала, што на прыём завітаў чалавек, які выказаў падзяку.

— Гэта дае ўпэўненасць, што тая грамадская работа, якой даводзіцца займацца, прыносіць вынік, — адзначае ён.

Пасля прыёму грамадзян Сяргей Анюхоўскі наведаў Слаўгарадскі філіял бабруйскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік» — для яго адкрыцця ён у свой час прыклаў шмат намаганняў. Сёння тут створана 55 рабочых месцаў, а калі вытворчасць запрацуе на поўную магутнасць, будзе ўсе 100. Сярэдняя зарплата на сённяшні дзень складае тут 1200-1300 рублёў. Для маленькага горада — вельмі нядрэнныя грошы. Асноўныя спажыўцы прадукцыі «Чырвонага харчавіка» — краіны СНД, ёсць попыт на яе ў Сярэдняй Азіі. Сярод новых партнёраў — Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Саудаўская Аравія.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар ДВА «Белпалівагаз» Аляксей КУШНАРЭНКА правёў адзіны дзень прыёму грамадзян на тэрыторыі трох раёнаў — Круглянскага, Бялыніцкага і Шклоўскага. Менавіта гэтыя раёны ён прадстаўляе ў парламенце.

Яшчэ да пачатку сустрэч з насельніцтвам ён наведаў у аграгарадку Філатава Круглянскага раёна ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Васіля Еўдакіменку. Мужчына — удзельнік дзвюх войнаў — савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай, ўдзельнічаў у баях за Ленінград, вызваляў Беларусь. Неаднойчы рызыкаваў жыццём, чатыры разы быў паранены. Сярод яго ўзнагарод ордэн Айчыннай вайны I ступені, ордэн Славы III ступені, медалі «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй».

Уручаючы ветэрану падарункі, Аляксей Кушнарэнка выказаў яму ўдзячнасць за мірнае неба.

— Перамога дала нам магчымасць будаваць незалежную краіну і з упэўненасцю глядзець у будучае, — падкрэсліў ён.

Пасля сустрэчы Аляксей Кушнарэнка разам з кіраўніцтвам Круглянскага раёна адкрыў патрыятычны клас у Цяцерынскай сярэдняй школе. Што датычыцца прыёму грамадзян, то іх у гэты дзень было некалькі. Асабліва актыўна ішлі людзі ў Круглянскім раёне.

— Напэўна, спрацавала інфармацыя аб адзіным дні прыёму грамадзян, — заўважыў сенатар. — Пытанні паступалі розныя, ад добраўпарадкавання тэрыторый да камунальных праблем. Усе яны ўзятыя на мой асабісты кантроль. Па некаторых з іх адразу ж былі дадзены тлумачэнні, астатнія прапрацоўваюцца.

Яшчэ некалькі чалавек прыйшло на прыём у Шклоўскім раёне. «Часам узнікаюць вельмі сур'ёзныя, маштабныя пытанні, якія патрабуюць уменняння ў дзеючае заканадаўства, — адзначыў парламентарый. — У Шклоўскім раёне, напрыклад, узнікла пытанне па нормах забеспячэння вадой у сельскай мясцовасці. Я як член Савета Рэспублікі буду разбірацца ў дадзеным пытанні, узніжаць усе неабходныя матэрыялы, і, калі спатрэбяцца нейкія карэкціроўкі, акцэнтаваць на гэтым увагу. Дзякуючы такім прыёмам мы маем магчымасць зрабіць пэўны зрэз настрою насельніцтва, зразумець, што іх хвалюе, і выпрацаваць падыходы па далейшым удасканаленні работы».

Мсціслаў, Дрыбін, Горкі — гэта тыя акругі, у якіх працуе **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Валерый ПАЛЯШЧУК**. Акрамя прыёму грамадзян па асабістых пытаннях, ён гэтым разам узяў удзел ва ўроку памяці, які адбыўся ў Раснянскай сярэдняй школе Дрыбінскага раёна, а пасля сумесна з кіраўніцтвам раёна і школьнікамі наведаў ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра Аксянкова.

— У Год гістарычнай памяці вельмі важна помніць пра подзвігі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, — падкрэсліла падчас вызнога пасяджэння **спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА**. — У нас вельмі добрая традыцыя пры наведванні рэгіёнаў, прадпрыемстваў, арганізацый прыходзіць у святыя для нас мясціны — брацкія магілы, памятныя знакі, мемарыялы. Як сказаў наш Прэзідэнт, Беларусь — гэта жывы помнік той вайне. Такіх месцаў смутку ў нас, на жаль, вельмі шмат. Мы схіляем галовы перад тымі, хто загінуў, хто адстаяў свабоду і незалежнасць нашай краіны, хто не дазволіў нацызму ўзяць верх. Мы ўшаноўваем памяць тых, хто загінуў, і не забываем пра тых, хто яшчэ з намі побач. На жаль, з году ў год ветэранаў становіцца ўсё менш, але мы шчаслівыя тым, што ёсць сведкі тых жахлівых падзей, якія могуць падзяліцца сваімі ўспамінамі і засцерагчы ад страшных памылак. Наш доўг і абавязак — перадаваць гэтую памяць з пакалення ў пакаленне. І моладзь павінна тое разумець. Хацелася б, каб усе мы разумелі каштоўнасць міру, спакою і цанілі, што маем магчымасць выхоўваць дзяцей пад мірным небам, працаваць і вучыцца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з сайтаў krugloe.by, dribin.by, slavgorod.by.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 10 мая 2022 года.

КРУПЫ НЕ ПСУЮЦЦА, АЛЕ...

Як правільна захоўваць прадукты

Па словах экспертаў, калі вы вырашыце запасацца крупамі, то варта закупіцца цэльнымі злакамі. Яны захоўваюцца даўжэй, бо тлустыя кіслоты ў стрыжні збожжа ахаваныя абалонкай. Аўсяныя крупы, у адрозненне ад шматкоў, пражыўць у два з паловай раза даўжэй, а нешліфаваны рыс захоўваецца на паўгода даўжэй, чым шліфаваны. Ды і больш карысныя такія крупы, бо абалонка багатая на клятчатку, мінералы і вітаміны.

Але ёсць адна небяспека, якая чакае ўсіх запаслівых, — насякомыя. І есці крупы, у якіх пасяліліся такія паразіты, нельга. Не дапаможа ні перабіранне збожжа, ні варка. Пасля сябе лічынкі пакідаюць скуркі, павуцінне, адходы стрававання.

Акрамя таго, пакуль лічынкі размнажаюцца, тэмпература і вільготнасць вакол іх растуць, а цяплічныя ўмовы ідэальныя для грыбкоў. У такіх крупах, макароне, муцэ можа сяліцца 250 відаў цвілі. Цвіль у крупах амаль не бачная, пры гэтым драбнюткія споры паражаюць усё вакол, зліваючыся па колеры з зернем. Самыя частыя грыбкі ў слоіках з крупамі — руковая, шэрая і жоўтая цвілі, якія вылучаюць ядавіты афлатаксін.

Спосабы захаваць прыпасы макароны, грэчкі ды гароху ёсць. Спецыялісты раяць для пачатку старанна вымыць і апрацаваць кладоўку спрэямі ад насякомых і цвілі. Акрамя таго, яны рэкамендуюць падтрымліваць на кухні вільготнасць не больш за 14 %. Аднак на звычайнай кухні гэта нерэальна. Але калі макарона, крупы, бабовыя ўжо закуплены на запас, паспрабаваць захаваць іх можна. Для гэтага трэба прыбрадь іх у максімальна цёмнае, прахалоднае і сухое месца.

Тэрмінам прыдатнасці ежы часам не варта верыць. У солі, цукру, мёду яны, па сутнасці, бязмежныя, а, напрыклад, у шакаладных плітках з начынкай, наадварот, часта завышаныя.

Эксперты таксама раяць замарожваць прадукты. У прыватнасці, гэта можна рабіць з хлебам, арэхамі, зяленівам і, вядома, мясам. Прычым чым большы кавалак, тым даўжэй ён будзе захоўвацца. Менавіта таму кускавое мяса можа ляжаць у маразілцы пару гадоў, а фарш — не больш за месяц. Замарожваць мяса пажадана ў шчыльных пакетах, а яшчэ лепш — запячатаць у вакуум.

У цэлым, спосабаў захаваць прадукты з розумам вельмі шмат. Хоць ці так ужо гэта і трэба, калі гаворка не ідзе пра запасы, набытыя на вялікім распродажы? Бо скупляюць жа тавары ў перыяд панікі і нявызначанасці і, як правіла, па рэкордна высокіх цэнах. Дык і ці вартае яно таго?

ЗАМАРЫЦЬ ЧАРВЯЧКА

Як зразумець, што ў вас глісты

Паразітаў у целе чалавека звычайна называюць гельмінтамі. У гэтае паняцце ўваходзяць усе чарвякі, якіх можна выявіць у розных аддзелах жывога арганізма. Сёння вылучаюць тры асноўныя віды гельмінтаў: стужачныя чарвякі, смактальшчыкі і круглыя чарвякі. Усе яны пранікаюць у арганізм чалавека цалкам незаўважна для яго. Гэтак жа ціха размнажаюцца і не меней спакойна прыводзяць да сур'ёзных ускладненняў. Аб тым, на якія сімптомы трэба звяртаць увагу і як з імі спраўляцца, як засцерагчы хатніх гадаванцаў, расказала ўрач (загадчык) аддзялення клінічнай лабараторнай дыягностыкі вышэйшай катэгорыі 11-й сталічнай паліклінікі Святлана ПАЛЬЧУК.

— Святлана Адамаўна, наколькі сёння актуальная праблема заражэння паразітамі?

— Гельмінтозы — шырокая група паразітарных захворванняў чалавека і жывёл, узбуджальнікамі якіх з'яўляюцца гельміны. Гельмінтозы сустракаюцца амаль паўсюдна, ва ўсіх кліматычных зонах, за выключэннем раёнаў вечнай мерзлаты, высакагор'яў і пустынь. Устаноўлена паразітаванне ў чалавека каля 300 відаў гельмінтаў, 50 з якіх шырока распаўсюджаны. Па афіцыйных даных СААЗ, у свеце аскарыдозам штогод заражаецца каля 1,2 мільярда чалавек, анкіластамідозамі — больш за 900 мільёнаў, трыхацэфалёзам — да 800 мільёнаў. У Беларусі дыягнастуецца да двух дзясяткаў відаў кішэчных і тканкавых гельмінтозаў, з якіх больш за 90 % складаюць энтэрабіёз і аскарыдоз.

Гельмінтаў называюць паразітамі, бо яны не могуць жыць і здабываць сабе ежу самастойна. У іх абавязкова павінен быць «гаспадар» — чалавек ці жывёла.

— Ці можна імі заразіцца дарослым? Альбо гэта праблема больш характэрная для дзяцей?

— На гельмінтозы хварэюць у любым узросце, аднак у групу рызыкі трапляюць дзеці 5—15 гадоў. Гэта звязана са спазнаннем навакольнага асяроддзя, слабым імунітэтам супраць глістнай інвазіі, недастаткова кіслым асяроддзем страўніка для знішчэння паразітаў. Гельмінты пашкоджваюць розныя органы, але асноўнае асяроддзе іх пасялення — кішэчнік.

— Дзе яшчэ яны могуць знаходзіцца?

— У залежнасці ад месца паразітавання ўзбуджальніка гельмінтозы падзяляюць на кішэчныя і пазакішэчныя. Яны могуць паразітаваць у печані, нырках, сасудах, жоўцевым пузыры.

— Як западозрыць заражэнне глістамі?

— Клінічныя праявы гельмінтозу разнастайныя і залежаць ад віду, колькасці гельмінтаў і органа, дзе яны паразітуюць, узросту, стану імуннай сістэмы. Захворванне мае востры ход — ад двух тыдняў да двух месяцаў — і хранічны, які працягваецца да некалькіх гадоў.

У вострым перыядзе найбольш характэрныя прыкметы інтаксікацыі і алергіі: агульнае недамаганне, дрыжыкі, ліхаманка, скурны сверб і сып, павелічэнне лімфавузлоў, сухі кашаль, задышка, боль у жываце, метэарызм, кішэчная непраходнасць.

— Асноўнай крыніцай паразітаў з'яўляюцца хатнія жывёлы?

— Так, гэта адна з магчымых крыніц. Яйкі глістоў прыносяць хатнія жывёлы, якія бываюць на вуліцы, — на лапах і поўсці. І зараз, як вядома, з хатнімі гадаванцамі мы ўзаемадзейнічаем асабліва цесна. Напрыклад, у Мінску зарэгістравана больш за 6,5 тысячы хатніх жывёл, і ў большасці выпадкаў чатырохногія сябры з'яўляюцца паўнапраўнымі членамі сям'і. Дастаткова пагладзіць гадаванца, пасля чаго выпадкова праглынуць яйка, лічынку гельмінта з уласных рук. Па гэтай прычыне існуе небяспека заражэння гельмінтозамі самога ўладальніка сабакі ці кошкі. Таксама трэба ўлічваць той факт, што гельмінтозы хатніх гадаванцаў адносяцца да антрапанозаў — групы інфекцыйных і інвазійных хвароб, агульных для жывёл і чалавека.

— Як не заразіцца глістамі?

— У паўсядзённым жыцці трэба прытрымлівацца некалькіх простых правілаў. Абавязкова тэрмічна апрацоўваць сырую рыбу і мяса, якія ўжываюцца ў ежу (ці для корму хатніх жывёл), тым больш невядомага паходжання. Выконваць простыя правілы асабістай гігіены, у тым ліку мыццё рук пасля вуліцы, перад ежай, пасля кантакту з грашыма і жывёламі. Старанна мыць садавіну, гародніну, ягады, нават калі яны з вашага прысядзібнага ўчастка. Не піць ваду і не мыць посуд і прадукты харчавання вадой, у бяспецы якой вы не ўпэўненыя.

Таксама важна ўстрымлівацца ад купання ў забруджаных прэсных вадаёмах, размешчаных непадалёк ад пашы, вадапояў жывёл. Імкнуцца пазбягаць кантакту з бадзяжнымі жывёламі. А калі вы трымаеце сабаку, штогод праводзьце прафілактычнае супрацьгліставае лячэнне свайго гадаванца з перыядычнасцю, рэкамендаванай ветэрынарам.

Раз на паўгода-год неабходна ў якасці прафілактыкі піць супрацьгліставыя прэпараты гаспадарам хатніх гадаванцаў. Засцерагайце ад забруджвання экскрэментамі сабак і катоў месцы для гульняў дзяцей: дзіцячыя пляцоўкі, пясочніцы. Неабходна, дарэчы, і дбайная санітарная апрацоўка дзіцячых цацак і прадметаў ужытку, дзіцячых пляцовак.

Прытрымлівайцеся правілаў засцярогі пры паходзе ў лес, падчас палявання і рыбалкі. Забяспечце абарону ад насякомых на кухні.

— Як даведацца, што ў табе хтосьці завёўся?

— Пры падазрэнні на гельмінтоз пацыента павінен агледзець гастраэнтэролаг, інфекцыяніст, паразітолаг, тэрапеўт або педыятр.

Больш дакладная дыягностыка гельмінтозу магчымая праз тры месяцы пасля заражэння, калі глісты становяцца палаваспелымі. Для дыягностыкі і маніторынгу лячэння захворвання выкарыстоўваюць некалькі лабараторных метадаў. Найперш прамыя — непасрэдна выяўляюць саміх гельмінтаў, іх яйкі і лічынкі. Робіцца саскроб на выяўленне яек вастрыц са скурнага покрыва перыанальной вобласці. Таксама можа праводзіцца даследаванне на яйкі, лічынкі гельмінтаў біялагічнага матэрыялу: калу, мачы, жоўці, макроты, слізі прамой кішкі). У асобных выпадках робіцца біяпсія мышачнай тканкі (пры падазрэнні на трыхінелёз).

Ёсць і ўскосныя метады вызначэння — па другасных змяненнях, якія ўзнікаюць у арганізме ў выніку жыццядзейнасці гельмінтаў. Гэта агульны аналіз крыві (пра заражэнне сведчыць павышэнне лейкацытаў і эазінафілаў), ІФА крыві на наяўнасць антыцел да гельмінтаў. Інструментальныя метады (МРТ, КТ, УГД, ФГДС, рэнтгенаграфія) дазваляюць удакладніць размяшчэнне гельмінтаў.

Ёсць спецыяльныя метады: малекулярна-біялагічныя (ПЛР), скурныя пробы з алабленымі таксінамі. Прымяняецца і апытанне пацыента аб ужыванні ў ежу на працягу апошніх 1,5 месяца харчовых прадуктаў з мяса свіней, кабаноў або іншых драпежных або ўсёедных жывёл. Гэта мае значэнне пры падазрэнні на цэніідоз (свіны і бычыны цэпні).

Трэба сказаць, што нельга якім-небудзь адзіным метадам выявіць усіх гельмінтаў, заселеных у страваванальнай сістэме чалавека. Да таго ж глістоў не заўсёды атрымліваецца выявіць з першага разу. Каб павялічыць верагоднасць выяўлення гельмінтаў у кале, неабходна здаць аналіз тройчы праз кожныя 3-4 дні.

Кожны тэст трэба правільна інтэрпрэтаваць. І зрабіць гэта можа толькі ўрач. Таму пры з'яўленні першых сімптомаў гельмінтозу звяртайцеся па медыцынскую дапамогу.

ДАРЭЧЫ

Глісты не любяць горычы і вострых прыпраў. Таму лічыцца, што часнок, цыбуля, пякучы перац і іншыя падобныя прыправы спрыяюць вываду глістоў. Але яны не з'яўляюцца асноўным метадам лячэння і выкарыстоўваюцца толькі як дапаможны сродак.

А вы ведалі?

Прадукты пчалярства: што нясе шкоду?

Некаторыя лічаць, што пчаліныя ўкусы дапамагаюць умацаваць здароўе, а таксама паменшыць колькасць зморшчынак. Хоць пацвярджэнні гаючых уласцівасцяў яду настойліва шукалі стагоддзямі, яны так і засталіся міфічнымі. Акрамя таго, пчаліны яд прызнаны адным з самых магутных і небяспечных алергенаў у свеце.

Ад укусаў звычайных пчол у год гіне ў тры разы людзей больш, чым ад яду змей. Бо, акрамя пчалінага таксіну, яд утрымлівае рэчыва гістамін, якое памнажае алергічную рэакцыю. Прычым арганізм можа без наступстваў перанесці серыю ўкусаў, а фатальным здольны стаць любы наступны.

У пчаліным ядзе ёсць амінакіслоты, ферменты, аднак панізіць халестэрын, пазбавіць ад рэўматызму, разгладзіць скуру ўсе гэтыя рэчывы не могуць, ды і шкода таксінаў перавешвае патэнцыйную карысць. Пчаліны яд калі і дзейнічае, то як плацэба, за кошт сваёй рэпутацыі.

Не прынясе карысці і пярга, у ёй не раз выяўлялі плесневыя таксіны. А вось пчаліны воск здароўю не нашкодзіць. Яшчэ бяспечны і нават карысны пропаліс. Гэта клей, які пчолы рыхтуюць з пылку і соку раслін, змешваючы з ферментамі сваёй сліны. Навукоўцы высветлілі, што гэтыя ферменты змяшчаюць прыродны антысептык, які эфектыўна змагаецца з бактэрыямі ў роце. Так што зубная паста ці жуйка з пропалісам у складзе, сцвярджаюць дантысты, — нядрэнны выбар.

Тысячы гадоў у культуры народаў усіх кантынентаў абсалютна заслужана апявалася праца гэтых насякомых. Без пчол і праўда на зямлі наступіць гуманітарная катастрофа. Але гэтая нікім не праплачаная PR-кампанія дазволіла прадаўцам пчаліных прадуктаў сэканоміць на рэкламе і прадаваць літаральна ўсё, у чым ёсць намёк на пчаліную прысутнасць. Але пчаліныя прадукты карысныя не ўсе. Нават ад мёду карысці няшмат, толькі псіхалагічная. Многім салодкае дапамагае справіцца са стрэсам.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Слуцкая нива» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА

(составные части и принадлежности: пристройка, сарай, навес),
общей площадью 25,6 кв. м, инв. № 640/С-108204, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624682700601000094 (право постоянного пользования) площадью 0,1485 га, по адресу: Минская область, Слуцкий район, Кировский с/с, д. Великое Журово, ул. Чапаева, 75.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Локня, пл. 0,1485 га.

Начальная цена без НДС – **1 629,33** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **162,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121081026001693300000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **13.06.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.06.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: (801795) 7-01-86, (8033) 396-34-64.

УНН 600043508

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

Лот № 1: здание гаража, общей площадью 1223 кв. м с инв. № 630/С-79859, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 2Б/1 (далее – Объект).

Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания Объекта будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0808 га, охранная зона магистральных трубопроводов, пл. 0,9286 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 199 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **19 980,00** бел. руб.
Цена снижена на 10 %.

Лот № 2:

• крытая крановая эстакада общей площадью 1162,8 кв. м, с инв. № 630/С-42062, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/9.

• сборно-тросовая мастерская, общей площадью 577,4 кв. м, с инв. № 630/С-42061, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/8 (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 233 928,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **23 392,00** бел. руб.
Цена снижена на 10 %

Лот № 3:

• цех металлообработки № 2 *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, дымовая труба)***, общей площадью 1222,0 кв. м. с инв. № 630/С-46869, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/4,**

• здание склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-46865 общей площадью 47 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/6 (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Объекты обременены договорами аренды (сведения можно получить у Организатора торгов).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 199 332,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **19 933,00** бел. руб.
Цена снижена на 30 %.

Лот № 4: экскаватор одноковшовый ЭО-3223, 2013 г. в., идентификационный № Y39Э0322230713874, инв. № по бух. учету 119591.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 30 780,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 078,00** бел. руб.
Цена снижена на 25 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 02.04.2022 (по лотам №№ 1,2), 27.01.2022, 02.04.2022, 19.04.2022 (по лоту № 3), 12.01.2022, 17.02.2022, 17.03.2022, 16.04.2022 (по лоту № 4).

Аукцион состоится **24.05.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.05.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,
телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый электронный аукцион по продаже:**

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2010 г. в., регистрационный знак ОК-5 5673, заводской № У397032230410544	4540	18 054,00	1 805,00
2	Прицеп тракторный 2ПТС-4, 1989 г. в., регистрационный знак БЭ 1475, заводской № 7953	8647	1 224,00	122,00
3	Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-6422 А5, 2009 г. в., регистрационный знак АН 2470-5, рама № Y3M6422A590001064, цвет белый	8417	13 056,00	1 305,00
4	Трактор гусеничный ДТ-75ЕМ, год выпуска не установлен, регистрационный знак ОК-5 5672	23020	2 754,00	275,00
5	Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-6422, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 8305-5, рама № Y3M6422A580000778, цвет белый	200785	6 426,00	642,00
6	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2011 г. в., регистрационный знак ОК-5 3151, заводской № У39ЭО32230411682, с дополнительным оборудованием: ковшом V=0,4 куб. м	48266	33 150,00	3 315,00
7	Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-6, 2009 г. в., заводской № 80	4631	7 854,00	785,00
8	Плуг болотный навесной ПБН-6-50	119600	3 672,00	367,00
9	Борона дисковая тяжелая Л-113 А-02 (БДТ-3)	119461	4 488,00	448,00
10	Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в.	5659	11 322,00	1 132,00
11	Агрегат дисковый навесной АДН 3.0 Р16, 2008 г. в., заводской № 132	23014	5 100,00	510,00
12	Агрегат дисковый навесной АДН 3.0 Р16, 2008 г. в., заводской № 128	119407	6 120,00	612,00
13	Плуг полунавесной оборотный ППО-(4+1)-40КЗ без модуля, 2009 г. в.	119458	6 324,00	632,00
14	Борона дисковая тяжелая Л-114 А-03 (БДТ-7), 2009 г. в.	119463	9 384,00	938,00
15	Борона дисковая навесная мелиоративная БДН-3А, 2013 г. в., заводской № 321	119598	9 282,00	928,00

Стоимость снижена на 15 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Электронные торги состоятся *24 мая 2022 года* в 10.00.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее *18 мая 2022 года включительно до 17.00* *.

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП).

Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321.

Контактные телефоны: +375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Продавец: ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (контактный телефон +375 (029) 351 10 33).

Консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по 18 мая 2022 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее 18 мая 2022 года включительно на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», назначение платежа: задаток для участия в аукционе 24.05.2022.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время. **Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by.**

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 02.03.2022, 16.04.2022.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;

- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;

- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

УНП 600077220

ПРОДАЕТСЯ СТОЛОВАЯ И ПОГРЕБ

ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5» (продавец) извещает о проведении 20 мая 2022 года открытого аукциона (повторно) по продаже имущества в 11.00 в городе Мозыре по улице Чапаева, 32

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 330/С-11181** площадью **488,7 кв. м**, назначение – здание нежилое, наименование – **столовая.** Адрес: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева, д. 149. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000007001200** общей площадью **0,1537 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания здания столовой. Местонахождение: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева, д. 149**	**279600,00**	27960,00
	Капитальное строение с инв. № 330/С-19049 площадью **95,6 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз метериально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **погреб.** Адрес: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева д. 149/1. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000007001200** общей площадью **0,1537 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания здания столовой. Местонахождение: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева, д. 149**	**11280,00**	1128,00

Продавец: ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5», г. Мозырь, ул. Чапаева, 32.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (02362) 3-26-62, 8 (033) 333-41-01 – Лукашевич О.В. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5»):** BY50 AKBB 3012 0554 9197 7330 0000 в ЦБУ № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Мозырь, БИК AKBBBY2X, УНП 400083995, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**;

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 мая 2022 г.** по адресу: г. Мозырь ул. Чапаева, 32, в рабочие дни с 08.00 до 12.00 и 12.45 до 16.45.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19 мая 2022 г. в 16.45 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **20 (двадцати) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Мозырский завод железобетонных изделий № 5» о порядке продаже с аукциона либо без проведения аукциона недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Мозырский завод ЖБИ № 5».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона находятся в приемной руководителя ОАО «Мозырский завод ЖБИ № 5».

Дополнительная информация по контактным телефонам: 8 (0236) 23-26-62 (тел./факс), 23-42-73.

Бацькаўшчына

У пошуках страчанага

ПА СВІСЛАЦКІМ КРАІ

У 2021 годзе горад Свіслач адзначыў свой чарговы юбілей. Паселішча ўпершыню згадваецца ў 1256 годзе ў Іпацьеўскім летапісе

І ў 2021 годзе намаганнямі Свіслацкага райвыканкама была выдадзена чарговая кніга філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава з серыі альбомаў «У пошуках страчанага» — «Ад Свіслачы да Белавежскай пушчы». Такім чынам і аўтар, і выдавецтва ТАА «Альфа-кніга» прадоўжылі творчы праект па ўзнаўленні памятак гісторыі з дапамогай старых паштовак «Бацькаўшчына».

Станцыя Свіслач. Пачатак XX стагоддзя.

Перагортваючы старонкі фаліянта, мы трапляем у розныя адметныя мясціны старажытнага краю. Знаёмімся са Свіслаччу першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Чыгуначны вакзал, Цэнтральная плошча, Уязная брама, помнік Рамуальду Траўгуту, настаўніцкая семінарыя, алея пры ёй, царква ў Свіслачы... Быццам трапляеш у жывую даўніну, шпацыруеш па старых вулачках мястэчка, знаёмішся з прашчурамі сённяшніх жыхароў пушчанскага краю. На адным са здымкаў — выкладчыкі Свіслацкай семінарыі. Цэлая кагорта адукаваных рупліўцаў асветы... Дарэчы, вядома, што ў настаўніцкай семінарыі, якая дзейнічала ў Свіслачы з 1876 да 1921 гг., выкладаў у 1877 — 1882 гадах этнограф Мікалай Нікіфароўскі. Болей за 20 гадоў этнограф, краязнавец, фальклярыст супрацоўнічаў са славутым даследчыкам П. В. Шэйнам, дасылаў яму фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Працавала ў Свіслачы і гімназія (была заснавана як Гродзенская губернская акадэмічная гімназія ў 1804 годзе; сродкі на адкрыццё выдаткаваў граф Вінцэнт Тышкевіч). У 1834-м навучальная ўстанова была пераўтворана ў павятовую гімназію, затым рэарганізавана ў павятовае вучылішча. Праз 16 гадоў — у пяцікласнае дваранскае вучылішча, якое было закрыта ў 1851-м... Гімназія ў Свіслачы лічылася базавай школай для Віленскага ўніверсітэта... Вучыліся ў Свіслацкай гімназіі выдавец, мемуарыст Адольф Белакоз (1826 — 1865), публіцыст Віктар Гельтман (1796 — 1874), гісторык, пісьменнік і фальклярыст Юзаф Ігнацы Крашэўскі, падарожнік Адам Сузін і шмат якія іншыя знакамітасці.

...У прадмове да кнігі старшыня Свіслацкага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр Вярсоцкі адзначыў: «...Старыя фатаграфіі ўзнаўляюць праўдзівую гісторыю нашага краю, адкрываюць для жыхароў раёна новыя гістарычныя факты, спрыяюць глыбокаму вывучэнню сваёй малой радзімы.

Кожны фотаздымак — унікальная ў сваім родзе старонка гісторыі. Гэта не проста адбітак ці вобраз эпохі, а сапраўдны гістарычны дакумент, які можа распавесці вельмі многае. Напрыклад, колькі ўсяго дзіўнага і непаўторнага мы страцілі ў гады разбуральнай Вялікай Айчыннай вайны». І далей: «Нашы продкі, ствараючы пэўны ўклад жыцця, перадаючы з пакалення ў пакаленне традыцыі і звычаі, пакінулі нам самае дарагое — памяць. І таму задача пакалення цяперашняга — зберагчы і прымножыць гісторыка-культурную спадчыну. Такі гістарычна і прыродна багаты край не можа не прыцягнуць увагу турыстаў і падарожнікаў».

Зазірнём у Поразава. Аўтар альбома, збіральнік старых артэфактаў запрашае нас да касцёла. А вось і сустрэча з хрэсным ходам у 1930-я гады. Ад двухпавярховай плябаніі ідзём да Свята-Нікольскай царквы. Зазірнём і ў школу. Вось вучні сабраліся на свята. А наступны здымак — заняткі па гімнастыцы...Сустрэнемся мы з поразаўцамі і на жніве. Стомленыя гаспадары на фоне складзеных у бабкі снапоў. Дарэчы, збор фатаграфічных выяў на поразаўскую тэму ў калекцыянера даволі істотны, таму і асобны раздзел у кнізе прысвечаны аднаму гэтаму паселішчу — «Поразава».

А ў раздзеле «Ваколіцы Свіслачы» — ілюстрацыйны расповед пра Баяры, Вердамічы, Вялікія Грынкі... Здымкі з Вялікіх Грынак — з 1917 года. На выявах — сяляне з рознымі сваімі клопатамі. Даволі цікавыя паштоўкі з Гарнастаевіч адлюстроўваюць сядзібны дом, аранжарэю, фрагмент парку... Улэўнены, што, пазнаёміўшыся з кнігай «Ад Свіслачы да Белавежскай пушчы», вы абавязкова выправіцеся ў падарожжа на Гродзеншчыну, да Свіслачы і яе ваколіц. Ды абавязкова зазірніце ў Белавежскую пушчу. А ў кнізе Уладзіміра Ліхадзедава, пра якую ідзе гаворка, — даволі цікавая віртуальная экскурсія і па Белавежскай пушчы. Сувенірныя паштоўкі з 1908 года знаёмяць з высакароднымі аленямі, зубрамі, дзікімі кабанамі, пасекай і пушчанскімі паселішчамі, прыгожым грабавым лесам... Часам здаецца, што зубры пазіравалі фатографам, даючы сябе як след разгледзець, магчымасць зрабіць надзвычай цікавыя пастановачныя кадры. Шэраг здымкаў — і пра ўраган, які нанёс Белавежскай пушчы немалую шкоду 15 чэрвеня 1904 года. Вядома, што гэтыя падзеі сфатаграфаваў В. Паўленка. Здымкі з'яўляюцца важнай гісторыка-прыродазнаўчай інфармацыяй. Уражваюць і выявы старых дрэў. Пэўна ж, магутныя дубы... А якім сімпатычным глядзіцца бор! Нельга адвесці вочы ад сувенірных паштовак з маляўнічымі фатаграфічнымі партрэтамі асобных сосен, альшаніку і асінніку...

Уражальная кніга калекцыянера, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава — адна з шэрага іншых альбомаў, што складаюць цэлую серыю пра гарады і рэгіёны Гродзеншчыны. У гэтай серыі ёсць рэдакцыйная калегія: А. Вярсоцкі, В. Лісковіч, В. Пранюк, І. Булаўка. Ужо ўбачылі свет кнігі пра Навагрудак, Смаргонь, Слонім... Будзем спадзявацца, што ўся Гродзеншчына знойдзе сваё ўвасабленне на старонках філакартычных альбомаў, падрыхтаваных Уладзімірам Ліхадзедавым. А мо і іншыя вобласці краіны ў межах праекта «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» здзейсняць падобнага характару выданні? Яны, несумненна, стануць добрымі дапаможнікамі ў школьным навучанні, у выхаваўчай, асветніцкай рабоце.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.
Фотаілюстрацыі з калекцыі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Імператарскі Белавежскі палац. Канец XIX стагоддзя.

Свіслач. Уязная брама. 1920-я гады.

Жыхары Свіслачы. 1920-я гады.

Стокі. Вясковая хата. 1916 год.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «вОплати мечту 13»

Сведения о рекламной игре:
Наименование рекламной игры: **«вОплати мечту 13».**
Территория проведения: Республика Беларусь.

Период проведения: с 2 декабря 2021 г. по 20 мая 2022 г.
В рекламной игре приняли участие 50 052 участника.
Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителями 30 (тридцати) призов «Смартфон Apple iPhone 13 128 GB Blue, Model A2635, MLP13RK/A, Китай, Артикул MLP13RK/A и денежные средства в размере 417,49 белорусского рубля» стали:

№	ФИО	№	ФИО	№	ФИО
1	Комисаренко Владимир Владимирович	11	Сугако Вадим Владимирович	21	Омельчук Алексей Александрович
2	Яглеева Ольга Сергеевна	12	Максимук Светлана Дмитриевна	22	Герилович Анна Васильевна
3	Фридман Владислав Михайлович	13	Животнюк Дмитрий Анатольевич	23	Устименко Андрей Владимирович
4	Рыбенок Наталья Васильевна	14	Тихонов Сергей Николаевич	24	Шарапов Сергей Анатольевич
5	Высоцкий Игорь Олегович	15	Ющик Анна Николаевна	25	Силивон Николай Николаевич
6	Кудерко Ольга Александровна	16	Королевич Дмитрий Геннадьевич	26	Василенко Олег Михайлович
7	Белькевич Артём Александрович	17	Овсянников Максим Валерьевич	27	Сивцов Алексей Николаевич
8	Козлюк Сергей Владимирович	18	Копытова Нина Анатольевна	28	Криштапова Юлия Николаевна
9	Филиппова Наталья Сергеевна	19	Рубцова Оксана Викентьевна	29	Ермаков Павел Владимирович
10	Гордей Алёна Евгеньевна	20	Беляковский Владислав Игоревич	30	Лепешинский Александр Сергеевич

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.
Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4114 от 25.11.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (29) 343 00 71 в будние дни с 10.00 до 18.00, а также с 12.00 до 14.00 в субботу, сайт o-plati.by.

Правила проведения рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 232 от 01.12.2021.

